СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.36, 19.50, 13.14;
Віцебск — 6.24, 19.41, 13.17;
Магілёў — 6.25, 19.39, 13.13;
Гомель — 6.22, 19.36, 13.14;
Гродна — 6.49, 20.06, 13.17;
Брэст — 6.54, 20.03, 13.09.

МЕСЯЦ:
Маладзік 3 красавіка.

ІМЯНІНЫ:
Васіля, Ісака;
Ісідара, Вацлава.

ЗВЯЗДА

4 КРАСАВІКА 1992 г.
субота № 70 (21848)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

РОЗГАЛАС

КАБ ШКОЛА САПРАЎДЫ БЫЛА БЕЛАРУСКАЙ

Колькі дзён таму ў Мінску прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская школа». Ладзіў яе Беларускі гуманітарны адукацыйна - культурны цэнтр, які праславіўся тым, што заняў памяшканне былой Вышэйшай камсамольскай школы. Гэта, бадай, першы збор нацыянальна-свядомай інтэлігенцыі, прысвечаны канцэпцыі нацыянальнай адукацыі.

У канферэнцыі бралі ўдзел народныя дэпутаты Лявон Баршчэўскі і Алег Трусаў, прафесары Уладзімір Конан, Юрый Хадыка, Уладзімір Кулажанка, Мікола Савіцкі, беларусы з Беластока і Гданьска, Вільні і Масквы. На жаль, адсутнічала кіраўніцтва Міністэрства адукацыі.

Канферэнцыя засведчыла: калі пра стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі слаба дбае ўлада, за справу —і шчыра, і кампетэнтна — бярэцца грамадства. Вырашана стварыць групы экспертаў, якія б укладалі і ацэньвалі навучальныя праграмы. Выпрабоўваць гэтыя праграмы будзе ліцэй пры Беларускім гуманітарным адукацыйна-культурным цэнтры.

Алесь КНЯЗЮК.
(БелаПАН).

ВЫДАННЕ, ДАСТУПНАЕ ЎСІМ

Беларусь ідзе цвёрдым курсам умацавання свайго суверэнітэту, таму заканадаўчае рэгуляванне нашага жыцця набывае выключнае значэнне. Ведаць законы і кіравацца імі ў паўсядзённых зносінах — святая святых для кожнага. У гэтым вам дапаможа такое выданне, як «Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь». «Ведамасці...» заснаваны ў 1990 годзе, выходзяць тры разы ў месяц на дзвюх мовах — беларускай і рускай. У іх публікуюцца законы, указы, пастановы і іншыя акты, прынятыя Вярхоўным Саветам РБ, яго Прэзідыумам. У параўнаўча маладога выдання ўжо ёсць свая шырокая аўдыторыя. Пастаяннымі падпісчыкамі «Ведамасцей...» з'яўляюцца многія работнікі савецкіх, прававых і гаспадарчых органаў, юрысты, іншыя спецыялісты народнай гаспадаркі, студэнты і пенсіянеры. Выпісаць «Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь» можна ў аддзяленнях сувязі па месцы жыхарства на любы тэрмін. Выданне даступнае ўсім, яго індэкс 75008.

МЫТНЯ «ІДЗЕ НА БАЛЬНІЧНЫ»

Па паведамленню газеты «Вячэрні Брэст» з 10 красавіка спыняецца эксплуатацыя мытнага КПП «Варшаўскі мост».

Рашэнне аб немагчымасці эксплуатацыі вынес галоўны дзяржаўны санітарны ўрач горада Вячаслаў Ракоць. Падставай для гэтага кроку паслужыў «надзвычай нездавальняючы стан памяшканняў КПП, невыкананне плана мерапрыемстваў па добраўпарадкаванню тэрыторыі».

Таццяна ГУСЕВА. (РІД).

«Дапамажыце атрымаць надзел зямлі»—

ПІСЬМЫ, ТЭЛЕГРАМЫ З ТАКОЙ ПРОСЬБАЙ ЛІТАРАЛЬНА ЗАХЛІСТВАЮЦЬ У ГЭТЫЯ ДНІ ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РЭСПУБЛІКІ

І. Кузьміцкі (ад імя членаў садаводчага таварыства «Усход» аб'яднання «Белбуднавука»):

— 10 гадоў назад нам выдзелілі ў Маладзечанскім раёне па 0,05 га зямлі. Зараз, згодна з Кодэксам, можна атрымаць да 0,1 га. Абіваем парогі кіраўнікоў саўгаса імя Я. Купалы і калгаса «Дуброва», да зямель якіх прымыкае наш участак. Звярталіся і ў Маладзечанскі райвыканком, у Пракуратуру рэспублікі — зямлю не даюць, у той час як іншыя таварыствы («Пралеска», «Мантажнік», «Ранет») яе атрымоўваюць. Дзе ж справядлівасць?

Тэлеграма ад **К. Шкуля** з пасёлка Мачулішчы:

— Адымаюць частку прысядзібнага ўчастка, які займае 20 сотак, для дачы немаведама кому. Скаргі ў сельсавет, абласную пракуратуру, камісію Гаркуна застаюцца без адказу. Калі скончацца здзекі над вёскай?

Заява **А. Пясоцкага** з вёскі Дворышча Дзяржынскага раёна:

— Прашу даць канчатковы адказ: ці магу я атрымаць зямлю для фермерскай гаспадаркі? Занёс заяву на выдзяленне 50 га зямлі ў Дзямідаўскі сельсавет. На сесіі Дзяржынскага райсавета У. В. Гаркун без усялякіх падстаў катэгарычна адхіліў маю просьбу.

І аналагічная — з Мінска, ад **Н. Ганічавай:**

— Дапамажыце атрымаць садовы ўчастак. Гарвыканком накіраваў маю заяву ў Мінскзеленбуд. А там пацікавіліся маімі заслугамі і сказалі больш не хадзіць.

Я — пенсіянерка, апякунка — выхоўваю непаўналетняе дзіця. Жывём на пенсію 460 рублёў, купляем толькі хлеб, малако ды бульбу.

— Год барацьбы за права атрымаць зямлю дазваляе сцвярджаць, што ў рэспубліцы пануе самавольства. У маёй справе аб іску да калгаса імя Фрунзе ніхто не ўспамінае Канстытуцыю, Дэкларацыю правоў і свабод чалавека, затое з упэўненасцю сцвярджаецца вяршэнства прыкладнага Статута калгаса над законам, — такое пісьмо напісаў **У. Шадэнка** з вёскі Дрэжна Віцебскага раёна.

Паўтара года абіває парогі раённых улад з просьбай даць зямельны надзел для фермерскай гаспадаркі У. Буднік з Ганцавіч.

— Жыву ў горадзе, а мяне пасылаюць у сельсавет, — скардзіцца ён. — Там жа разводзяць рукамі, маўляў, зямлі няма. У нашым раёне зямлю не хочуць даваць нікому.

Тэлеграма з Гомеля ад **Р. Дзегцярова:**

— Сабатуецца выдзяленне зямлі пад садовае агародніцтва. «Гомсельмаш» абяцаў даць усім жадаючым па 10 сотак. У цэху 400 чалавек, а ў латарэі разыгрываліся толькі два ўчасткі...

На заканчэнне сігнал **А. Дымшы** з вёскі Першамайская Бярозаўскага раёна. У ім, бадай, найбольш яскрава адлюстраваліся боль і адчай усіх, хто хоча — ні многа, ні мала — засеяць невялікі надзел зямлі, што належыць ім па закону.

— Звяртаюся да вас з апошняй надзеяй: два гады спрабую стварыць фермерскую гаспадарку. Звяртаўся ў саўгас, выканком, пракуратуру, у раённы і абласны суд — зямлю не даюць. Выхад адзін — палітычны пратэст супраць той зямельнай рэформы, якая вядзецца па чыноўніцкіх законах.

У панядзелак ход выканання зямельнай рэформы будзе разгледжаны на пасяджэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Ці панясуць, урэшце, пакаранне тыя, хто вось так «свабодна» маніпуліруе заканадаўствам?

Людміла ДРАЗДОВА.

ДАЕШ РАЗРАД!

Аб мерах, якія прымае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай абароне насельніцтва, паведаміў журналістам на прэс - канферэнцыі Старшыня Дзяржкамітэта па працы і сацыяльнай абароне Г. Бадзей.

Ён падкрэсліў, што мэта ўрада ў гэтым напрамку — распрацоўка цэласнай сістэмы абароны грамадзян у цяперашняй эканамічнай сітуацыі. Нядаўна, напрыклад, Савет Міністраў распрацаваў новую тарыфную сетку, якая складваецца з 28 разрадаў. У аснове яе— мінімальная заработная плата 550 рублёў. Першы разрад у сетцы — 600 рублёў. Кожны наступны адрозніваецца на 11 працэнтаў, а больш высокія стаўкі —з 22 па 28 разрад — павялічваюцца толькі на 9 працэнтаў.

Паводле слоў Г. Бадзея, па дваццаць восьмаму разраду будуць атрымліваць грошы толькі два чалавекі ў рэспубліцы: Старшыня Вярхоўнага Савета і Прэм'ер-міністр. Тарыфная сетка будзе выкарыстоўвацца толькі ў бюджэтных арганізацыях. Самастойныя прадпрыемствы могуць разглядаць яе, як рэкамендацыі.

Беларусь—Літва: новы этап супрацоўніцтва

У час падпісання Пагаднення.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Здаецца, што пасля эйфарыі ад абвяшчэння незалежнасці рэспублікі прыходзяць нарэшце да асноватворнай думкі — паасобку жыць і працаваць немагчыма, час аднаўляць парушаныя эканамічныя сувязі. І не проста аднаўляць, а падымаць іх на больш высокі ўзровень.

У гэтым кантэксце трэба, напэўна, разглядаць і афіцыяльны візіт урадавай дэлегацыі Беларусі на чале са Старшынёй Савета Міністраў В. Кебічам у Літоўскую Рэспубліку, які адбыўся 2 красавіка.

На граніцы гасцей сустракаў міністр замежных спраў Літвы А. Саўдаргас. Тут журналісты спыталі Вячаслава Францавіча, з якім настроем ён едзе ў Вільнюс, і пачулі лаканічны адказ: з дзелавым. І трэба адзначыць, што менавіта гэты настрой вызначаў ход усіх сустрэч і гутарак у сталіцы Літвы.

Адбыліся перагаворы В. Кебіча і прэм'ер - міністра Літоўскай Рэспублікі Вагноруса, на якіх абмяркоўваўся шырокі спектр двухбаковых адносін, а таксама шэраг іншых пытанняў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Пасля іх завяршэння бакі падпісалі Пагадненне аб прынцыпах гандлёва - эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі рэспублікамі на 1992 год. У ім, у прыватнасці, прадугледжваецца прыняць неабходныя меры па выкананню ўзаемных паставак прадукцыі, садзейнічаць стварэнню сумесных прадпрыемстваў, удзельнічаць інвестыцыямі ў ажыццяўленні сумесных праграм і праектаў, забяспечваць прававую абарону дзяржаўнай уласнасці, уласнасці юрыдычных асоб і грамадзян і т. д.

Пасля падпісання дакументаў журналісты пацікавіліся ў прэм'ер - міністраў, як яны ацэньваюць пагадненне?

— Хоць мы і заключылі гэтае пагадненне толькі сёння,— адзначыў Г. Вагнорус, — але тое, што наша эканамічнае супрацоўніцтва на працягу трох першых месяцаў гэтага года развівалася паспяхова, сведчыць: у нас складваюцца ўзаемавыгадныя сувязі і без пратаколаў. Гэтае пагадненне завяршае першы этап у літоўска - беларускіх адносінах, і ў далейшым мы можам разглядаць іншыя дакументы.

— Хацелася б выказаць удзячнасць літоўскім калегам за тое, — сказаў В. Кебіч, — што яны з разуменнем паставіліся да ўзнятых намі пытанняў і, у прыватнасці, тых, якія звязаны з забеспячэннем Беларусі электраэнергіяй. У выніку перагавораў з панам Вагнорусам дасягнута дамоўленасць аб тым, каб выдзеліць гэтую праблему ў якасці асобнай і на даўгачасовай аснове падпісаць спецыяльнае пагадненне. Мы практычна нідзе і ні ў чым не разышліся ў думках.

У другой палавіне дня Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. Кебіч быў прыняты Старшынёй Вярхоўнага Савета Літоўскай Рэспублікі В. Ландсбергісам. У ходзе гутаркі абмеркаваны пытанні беларуска - літоўскай граніцы, свабоды руху тавараў, пагранічных пераходаў з Польшчай і шэраг іншых праблем. Бакі былі аднадушнымі ў тым, што неабходна забяспечыць свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей, уключаючы стварэнне беларускіх школ у Літве і літоўскіх—у Беларусі.

У час знаходжання ў Літоўскай Рэспубліцы В. Кебіча суправаджалі намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларусі С. Брыль, міністр замежных спраў П. Краўчанка і іншыя афіцыяльныя асобы.

Сяргей БУЛАЦКІ.
(Служба інфармацыі беларускага ўрада).

20 РУБЛЁЎ ЗА ЛІТР БЕНЗІНУ ПЛАЦІЦЬ, МОЖА, І НЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА

Тое, што абяцанае ўрадам Расіі вызваленне цэн на нафту закране не толькі аўтааматараў, чые машыны ўжо сёння ледзьве не кіламетровымі чэргамі стаяць да кожнай працуючай бензакалонкі, зразумела нават дзецям. Чуткі разносяцца самыя страшныя, лічбы называюцца фантастычныя. Абрыдлы журналісцкі штамп застойных часоў—«чорнае золата»—пагрозліва набывае рэальны сэнс.

Але ўсё ж, чаго нам чакаць ад адпушчаных цэн на энерганосьбіты? З гэтым пытаннем карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да намесніка старшыні Дзяржкамітэта па забеспячэнню нафтапрадуктамі РБ Валерыя ЗАРАНКА.

— Літаральна днямі наш урад звярнуўся да ўрада Расіі з прапановай да канца бягучага года захаваць на нафту фіксаваную цану. Узяць за аснову той узровень, які абгаворваўся ў канцы мінулага года, і сённяшнія свабодныя цэны на расійскім рынку, вывесці нейкую сярэднюю лічбу і ёю ўжо кіравацца — каб не было рэзкіх скачкоў і вялікіх перакосаў. Гэтая «сярэдняя» цана бачыцца дзесьці на ўзроўні 2 тысяч рублёў за тону.

— Прапанова датычыць усёй СНД ці толькі Беларусі?

— Толькі гаспадарчых сувязей з Рэспублікай Беларусь. Цяжка пакуль сказаць, ці пойдзе расійскі ўрад нам насустрач.

А на сённяшні дзень у нас існуюць дзве цаны: 350 рублёў за тону плюс 28 працэнтаў падатку (што ў выніку дае 448 рублёў) і свабодная, па якой рэспубліка атрымлівае 40 працэнтаў усёй сваёй нафты ў межах вызначанай Расіяй квоты. Свабодная цана цалкам залежыць ад аб'яднання-пастаўшчыка, ад умоў дагавора — ёсць 2.500 рублёў за тону ? ёсць 3.500, 4.500 рублёў. Ёсць нават 8 тысяч рублёў — самая высокая цана, па якой прапануе сваю прадукцыю аб'яднанне «Сургутнафтагаз». Выходзячы з сярэдніх цэн на нафту, мы ўстанаўліваем цэны, па якіх у перапрацоўчых заводаў прадпрыемстваў рэспублікі закупляюць увесь пералік нафтапрадуктаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ЛІМІТНЫЯ КНІЖКІ ДЛЯ АЎТААМАТАРАЎ

Уладальнікі асабістага транспарту з брэсцкімі нумарамі спяшаюцца набыць лімітныя кніжкі, без якіх брастчане надалей (з 6 красавіка) не атрымаюць месячную норму бензіну: 80 літраў— на аўтамабіль, 40 — на матацыкл.

«ШМАТРАЗОВЫЯ» ТАЛОНЫ

З сейфа «Саюздруку» ў Брэсце ўкрадзены праязныя аднаразовыя талоны на суму 6 тысяч рублёў, праязныя білеты — 80 штук па 27 рублёў і столькі ж па 21 рублю.

Таццяна ГУСЕВА. (РІД).

«ЗВЯЗДА» Ў КІЁСКАХ «САЮЗДРУКУ». ЁСЦЬ ПАДСТАВЫ ДЛЯ АПТЫМІЗМУ

Ніводнага вытворцу не можа не цікавіць, як разыходзіцца яго прадукцыя. Безумоўна, непакоіць і нас, як «ідзе» «Звязда» ў рознічным продажы. На вялікі жаль, мы не можам цяпер аналізаваць даных па продажу «Звязды» ў сакавіку гэтага года, але даныя «Саюздруку» за студзень і люты па «Звяздзе» ўсё ж даюць нейкія падставы для аптымізму. Як нам, газетчыкам, так і вам, чытачам.

Вельмі добра раскупліваюць газету ў Мінскай вобласці. Калі за студзень было спісана 2 171 экземпляр «Звязды», то ўжо ў лютым—усяго 353. І гэта пры тым, што кожны дзень у кіёскі «Саюздруку» Мінскай вобласці паступала 2 250 экземпляраў газеты.

Рэзкі прагрэс у гэтым плане можна заўважыць і па Брэсцкай вобласці. Нямшат спісана газеты і ў Гомельскай вобласці.

Нам цяжка знайсці прычыны, чаму не «ідзе» «Звязда» ў віцебскіх кіёсках «Саюздруку», але факт застаецца фактам. За студзень там спісана 7 575 экземпляраў, за люты — 7 846 пры штодзённым паступленні 2 250 штук.

Не вельмі добра абстаяць справы з распаўсюджваннем нашай газеты ў Мінску. Цяпер пройдземся па раённых цэнтрах.

Смаргонь. Ёсць даныя за сакавік. Раскупляемасць — 100 працэнтаў. Кожны дзень сюды паступае 70 экземпляраў.

Шклоў. На горад ідзе 50 экземпляраў. Распрадаецца ў сярэднім 30. Але няма апошніх даных за сакавік.

Ляхавічы. Гэта горад, дзе на «Звязду» заўсёды няблага падпісваліся і куплялі. Працэнт спісання за сакавік нязначны.

Салігорск. Усе 130 экземпляраў «Звязды», якія паступаюць у горад штодзённа, разыходзяцца стопрацэнтна. Мясцовыя паштавікі лічаць, што гэта цікавая газета, пры гэтым зазначаючы: «Известия» ўжо ляжаць мёртвым грузам у кіёсках пры цане 2.50 за нумар.

Нейкіх закулісных гульняў з нашай газетай высветліць не ўдалося. Нават шматлікія апытанні мінскіх кіяскёраў паказалі: адносіны да газеты ў цэлым неблагія, і яе ў далёкі куток не засоўваюць, а кладуць побач з усімі штодзённымі газетамі на бачным месцы ў кіёску. Так што да ўсяго сказанага застаецца дадаць: купляйце, чытайце, глядзіце «Звязду», адзіную штодзённую беларускую газету!

Аляксандр КОКТЫШ.

ДА ВЕДАМА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзевятая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прадоўжыць сваю работу 7 красавіка 1992 года ў 9 гадзін 30 хвілін у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

НАПЯРЭДАДНІ

ГЛАВА АЛІМПІЙСКАЙ СЯМ'І

У панядзелак у Мінск з аднадзённым афіцыйным візітам прыбывае прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта сеньёр Х. А. САМАРАНЧ

Гэтага прыемнага і шчырага чалавека мне даводзілася бачыць і чуць шмат разоў. На афіцыйных прэс-канферэнцыях і прыёмах, у кулуарах чэмпіянатаў свету і самых буйных міжнародных турніраў ён заўсёды ветлівы і ўважлівы да нас, журналістаў. Здаецца, няма пытання, на якое прэзідэнт МАК не дасць ці не ведае адказу...

З ДАСЬЕ «ЗВЯЗДЫ»
Хуан Антоніо Самаранч нарадзіўся ў 1920 годзе ў Барселоне. Вядомы іспанскі бізнесмен, дыпламат, палітычны і спартыўны дзеяч. Адзін з багацейшых людзей Іспаніі, тэкстыльны магнат і кіраўнік буйнейшага банка. У маладосці захапляўся боксам, быў тансама капітанам зборнай Іспаніі па хакею на ролікавых каньках, якая станавілася чэмпіёнам свету. Узначальваў дэлегацыі Іспаніі на Алімпійскіх гульнях 1956 года ў Карціна д'Ампеца, Рыме (1960 г.), Токіо (1964 г.). З 1966 года — член Міжнароднага алімпійскага камітэта, з 1970-га — прэзідэнт НАК Іспаніі. З 1977 па 1980 год — пасол Іспаніі ў Савецкім Саюзе. З 1980-га — прэзідэнт МАК.

...Ён вельмі любіць рускую зіму і калекцыяніраваць спартыўныя паштовыя маркі... Заўзяты балельшчык зборнай па хакею... былога Саюза ССР. У якасці прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта сеньёр Самаранч наведаў за 11 гадоў звыш 160 краін свету, а кожную раніцу, прысвячаючы 30—40 мінут гімнастычным практыкаванням, любіць... пастаяць на галаве...

Няўжо гэта адзін і той жа чалавек?

Так, гэта ён — «бацька» самай вялікай сям'і на планеце — алімпійцаў усіх краін свету.

Прэзідэнтам Міжнароднага алімпійскага камітэта ён абраны ў 1980-м — напярэдадні Маскоўскай Алімпіяды, дарэчы — у дзень свайго шасцідзесяцігоддзя. Сярод чатырох прэтэндэнтаў на гэты высокі і ганаровы пост ён ўжо ў першым туры галасавання набраў патрэбную колькасць галасоў. Гэты вынік, як сцвярджалі тады каментатары, стаў і нечаканым, і неверагодным...

А да гэтага сеньёр Самаранч чатыры гады ўзначальваў пасольства сваёй радзімы — Іспаніі ў нашай краіне. Чаму менавіта яго іспанскі кароль Хуан Карлас накіраваў у Маскву паслом — першым паслом Іспаніі пасля аднаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі — і да сённяшняга дня застаецца таямнічай загадкай.

А можа, гэта і ёсць феномен Самаранча?!

Поспехаў ва ўсім — палітыцы і спартыўнай дзейнасці, бізнесе і дыпламатыі (чаго было варта сабраць пасля байкотаў Алімпіяд у Маскве (1980 год) і Лос-Анджэлесе (год 1984) прадстаўнікоў 160 краін на Гульнях 1988 года ў Сеуле!) — яму ўдаецца дасягнуць дзякуючы незвычайнай працавітасці, кампетэнтнасці, уменню знаходзіць кантакты з самымі рознымі людзьмі. Сеньёр Самаранч ідэаліст і прагматык — адначасова.

...Шмат краін у адказ на наша ўварванне ў Афганістан аб'явілі байкот Маскоўскай Алімпіяды 1980 года. Нагадаю яшчэ раз: Самаранч тады толькі-толькі ўзначаліў МАК. Мы, вядома ж, па распрацаванаму на Старой плошчы сцэнарыю нанеслі ўдар — наіўны і безразважлівы — у адказ: падалі «прыклад» і падбухторылі большасць краін «сацыялістычнай садружнасці» на байкатаванне Гульняў у Лос-Анджэлесе. У спорт, такім чынам, умяшалася недалёка ідучая палітыка, і міжнародны алімпійскі рух апынуўся на мяжы развалу.

Хуан Антоніо Самаранч неадкладна паімчаўся ў Маскву. Яго намерамі былі неадкладная сустрэча і перамовы з тагачасным лідэрам краіны Саветаў Канстанцінам Чарненкам. Аднак той — факт, варты Кнігі рэкордаў Гінеса — упершыню ў гісторыі міжнароднага алімпізму главу МАКа не прыняў. У былой савецкай сталіцы прэзідэнту Міжнароднага алімпійскага камітэта наладзілі прыём у намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР Мікалая Талызіна, які меў аб міжнародным алімпійскім руху самыя далёкія паняцці. Па сусветных канонах і мерках функцыянер сярэдняга ўзроўню паімкнуўся было расказаць прэзідэнту МАК пра... Савет Эканамічнай Узаемадапамогі, будаўніцтва... нафтаправода з Сібіры ў краіны сацыялістычнай садружнасці... Усё гэта моцна пакрыўдзіла Самаранча, і ён потым расказваў нам: «Я ездзіў у Маскву дзеля гісторыі...»

Ён пакрыўдзіўся, але не расчараваўся ў нашай краіне. Ён добра ведае і яе, і наш народ. І якім вялікім было здзіўленне літаральна ўсіх, калі адразу пасля нашага байкоту Лос-Анджэлеса прэзідэнт МАК зноў паспяшаўся ў савецкую сталіцу.

Гэта быў першы ягоны крок да трыумфу ў Сеуле, на Гульнях XXIV Алімпіяды.

Толькі аднаму яму, сеньёру Самаранчу, вядома і тое, як, якім чынам фінансавыя справы Міжнароднага алімпійскага камітэта са становішча банкрута зноў узняліся да працвітання і вялікіх барышоў. Нагадаю: Манрэальскія Гульні 1976 года прынеслі Канадзе мільярд долараў страт, а Сеульская Алімпіяда-88 — наадварот — прыбыткі... Спонсарства — раз, удзел у фінансаванні алімпізму сусветна вядомых кампаній і карпарацый — два... Што яшчэ — гэта ўжо сакрэты прэзідэнта МАК.

Прыемны і шчыры чалавек, сеньёр Самаранч адначасова і катэгарычны, так бы мовіць, жорсткі функцыянер і адміністратар. Аднойчы мы спыталіся ў яго аб адносінах да аматараў допінгу, і твар прэзідэнта стаў суровым і, як мне падалося, злосным. У самы бліжэйшы час ён мае намер прыняць надзвычай жорсткія меры да прыхільнікаў стэроідаў, наркотыкаў і іншых прэпаратаў, прычым не толькі да тых, хто іх ужывае, але і да ўрачоў, менеджэраў, трэнераў — людзей, што акружаюць атлетаў, «натхняюць» іх і штурхаюць на выкарыстанне забароненых сродкаў. «Спорт павінен быць чысты і сумленны», — любіць паўтараць Самаранч.

На пытанне, якое задаў аднаго разу я яму: «Ці падабаецца вам работа на пасту прэзідэнта МАК?», сеньёр Самаранч адказаў: «Вельмі падабаецца! Клопатаў шмат, але я атрымліваю ад гэтага вялікае задавальненне...»

Амаль палавіну часу аддае ён зараз паездкам па ўсяму беламу свету. Устанаўленне асабістых кантактаў з кіраўнікамі краін, наведванне дзяржаў — новых членаў Міжнароднага алімпійскага камітэта, знаёмства са становішчам спорту ў свеце — вось, бадай, асноўныя мэты гэтых падарожжаў. З такімі ж задумамі прыбывае сеньёр Самаранч і ў Мінск. Ён сустрэнецца са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславам Шушкевічам і прэм'ер-міністрам Вячаславам Кебічам, наведае спартыўныя аб'екты рэспублікі, правядзе грунтоўныя гутаркі са спартыўнымі работнікамі, у тым ліку і прэзідэнтам НАК Беларусі Уладзімірам Рыжанковым. Глава алімпійскай сям'і, як і заўсёды, больш будзе глядзець і слухаць, чым гаварыць сам. Гэта — ягоная звычка, манера паводзін. І — дзеянняў.

А як жа інакш! Інакш не быў бы ён ні прэзідэнтам Міжнароднага алімпійскага камітэта, ні, прынамсі, Самаранчам...

Анатоль МЯСНІКОЎ.

На здымку: 1980 год. Прэзідэнт МАК Хуан Антоніо **Самаранч** уручае Алімпійскі ордэн трохразоваму алімпійскаму чэмпіёну мінчаніну Аляксандру **Мядзведзю.**

ЕЎРОПА І БЕЛАРУСЬ

У ВЕНЕ ТОЛЬКІ БЕЛАРУСЬ НЕ ПРАСІЛА ГРОШАЙ

Днямі ў сталіцы Аўстрыі завяршыўся трохдзённы кангрэс Еўрапейскага згуртавання па кіно і аўдыёвізуальнай інтэграцыі Усходу і Захаду. Арганізавалі кангрэс Міністэрства замежных спраў Францыі, Аўстрыйскі ўсходні фонд і Фонд Гутэнберга. Мэтай форуму было знаёмства заходніх краін з краінамі былога сацыялістычнага лагера і дзяржавамі СНД у галіне кіно, відэо, тэлебачання і сувязі, наладжванне адпаведных кантактаў. У Вену на кангрэс з'ехаліся прадстаўнікі Румыніі, Польшчы, Венгрыі, Югаславіі, Чэха-Славакіі, Балгарыі і нават Албаніі. Былы Савецкі Саюз прадстаўляла шматлікая дэлегацыя з Масквы, а таксама прадстаўніхі Літвы, Латвіі і Беларусі. Ад імя нашай рэспублікі выступалі тры чалавекі — кіраўнікі студыі АБЦ (Анімацыйны Беларускі Цэнтр, аб якім «Звязда» ўжо расказвала): дырэктар студыі Ігар Казак, мастацкі кіраўнік Алег Белавусаў і намеснік рэдактара па гуманітарных сувязях Аляксандр Давідовіч. Мы даведаліся ў Алега Белавусава аб ходзе кангрэса, аб перспектывах Беларусі як тэледзяржавы і іншых рэчах.

ЕЎРОПА Ў НАС ЗАЦІКАЎЛЕНА

На Венскі кангрэс з боку краін капіталістычнага свету з'ехаліся даволі вядомыя людзі, у асноўным на ўзроўні бундэсміністраў па культуры і прадстаўнікоў буйнейшых еўрапейскіх тэлевізійных кампаній, іншых еўраінстанцый. Ад самой Аўстрыі прысутнічаў федэральны міністр адукацыі і культуры доктар Рудольф Шотэн, а Савет Еўропы прадстаўляў эксперт па аўдыёвізуальнай інфармацыі П'ер Мюсо. Усё гэта сведчыць аб тым, што еўрапейскія краіны вельмі зацікаўлены ў нас і хацелі даведацца, што мы сабой уяўляем як партнёры. Нездарма пад форум выдзелілі знакаміты будынак венскага Кангрэс-Хале, у другіх пакоях якога адначасова праходзіў кангрэс па звычайнай зброі. З намі гатовы супрацоўнічаць, нават на дзяржаўным узроўні, аднак вельмі баяцца нестабільнасці ў краінах Усходняй Еўропы, і асабліва ў СНД. Да таго ж пад «прыгожыя вочкі» ніхто з заходнееўрапейскіх бізнесменаў ад культуры грошы даваць не збіраецца. А ўвесь кангрэс прайшоў, на жаль, менавіта пад знакам нашага своеасаблівага жабрацтва...

А Ў ЧЫМ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ МЫ!

Як гэта ні прыкра, але кангрэс пакінуў даволі сумнае ўражанне менавіта з-за пазіцыі нашых былых «саюзнікаў» і «суайчыннікаў». Усе яны ў адзін голас, амаль як жабракі на цвінтары, прасілі грошай. Асноўны лейтматыў кангрэса — «Дайце нам грошай». Польская дэлегацыя скардзілася, што ў іх, маўляў, у Гданьску маленькая студыя, і для яе ўзбудаўнення патрэбны фінансы. Югаславы спасылаліся на грамадзянскую вайну і таксама прасілі грашовую дапамогу. Гэтак жа маскоўская і астатнія дэлегацыі. На гэтым фоне вельмі адрозніваліся пазіцыя нашай, беларускай, дэлегацыі. Гэта была, па сутнасці, адзіная «каманда», якая не прасіла, а нешта прапаноўвала. Студыя АБЦ — ужо гатовыя анімацыйныя фільмы, дакументальныя стужкі, іншыя формы супрацоўніцтва. Гэта выклікала павагу з боку прадстаўнікоў Захаду, і ў іх з'явілася жаданне нам дапамагчы.

«АЛІСА», АЛЕ НЕ БІРЖА

Вось адзін з праектаў, які павінен выклікаць пэўную цікавасць, асабліва ў беларускіх прадпрымальнікаў. Існуе еўрапейскі тэлечасопіс пад назвай «Аліса». Ён дэманструецца на экранах Італіі, Іспаніі, Францыі, Германіі, Аўстрыі і іншых краін. Паказ часопіса доўжыцца 52 хвіліны, перыядычнасць — адзін раз у тыдзень. Да нядаўняга часу карэспандэнцкія пункты «Алісы» былі толькі ў Санкт-Пецярбургу і Рызе. Зараз ёсць дамоўленасць аб адкрыцці карпункта ў Мінску. Што ў гэтым карыснага? Справа ў тым, што 52 хвіліны ў тыдзень ідзе інфармацыя аб культуры, палітыцы, эканоміцы з усіх еўрапейскіх краін. Цяпер яны гатовыя ўключыць у гэты тэлечасопіс і Беларусь са сваімі сюжэтамі. У сувязі з тым, што «Аліса» — часопіс не вельмі багаты, яго кіраўнікі «заплюшчваюць вочы» на тое, што ў канцы ці пачатку кожнага сюжэта ідзе рэклама з адпаведнай краіны. Напрыклад, МАЗ ці Мінскі завод халадзільнікаў вырашаць даць рэкламу ў мінскі карпункт «Алісы». Яна абыдзецца ім практычна бясплатна (па еўрапейскіх мерках), і без усялякіх перашкод разыдзецца па ўсёй Еўропе. Акрамя таго, калі будзе дамоўленасць з Беларускім тэлебачаннем, можна будзе кожны тыдзень паказваць гэтую гадзінную еўрапейскую праграму нашым землякам. Гэта вельмі важна. Бо ў час кангрэса склалася ўражанне, што і мы пра іх амаль нічога не ведаем. Але не толькі «Аліса» зможа дапамагчы Беларусі. Існуе яшчэ еўрапейскі культурны канал, які абслугоўвае ўсе краіны Еўропы некалькі гадзін ў тыдзень. У прадстаўнікоў студыі АБЦ адбылася сустрэча з менеджэрам гэтага канала. Ён заверыў, што канал гатовы выкарыстоўваць беларускую аўдыё- і відэапрадукцыю, а гэта дапаможа нам яшчэ больш увайсці ў інфармацыйную сетку Еўропы.

ПОВАР, КУРСАНТ І Г. Д.

У студыі АБЦ існуе дамоўленасць з адной французскай фірмай аб сумесным вытворчасці на Беларусі. Французскія партнёры жадаюць здымаць у нас цікавыя сюжэты. Напрыклад, аб повару, які кожны дзень ходзіць на работу з жаданнем стварыць што-небудзь смачнае з нашых нешматлікіх прадуктаў. Ці аб курсанце вышэйшага ваеннага вучылішча, дзеля чаго ў Мінскім ВІЗРВ ужо адабрана кандыдатура. Французы гатовы здымаць у нас стужкі на самую розную тэматыку. А гэта ж яўны прыток так не хапаючай зараз валюты.

БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА З АМЕРЫКАЙ!

На кангрэсе ў Вене вельмі яскрава прагледжвалася спроба супраціўлення еўрапейскіх краін амерыканскай экспансіі. Уся Еўропа ўжо завалена амерыканскай кінапрадукцыяй. Менавіта таму на кангрэсе гучалі словы аб тым, што мы ўсё-такі еўрапейцы, у нас свая культура, свае традыцыі і эстэтыка, таму трэба змагацца з Амерыкай. А яна, дарэчы, здольна «задушыць» усе краіны па адной. Вось з гэтага пункту гледжання еўрапейскія босы і прыглядаліся да краін СНД—падымем рукі ўгору перад амерыканскай нізкасортнай прадукцыяй ці разам пачнём змагацца супраць яе. Тут мы іх расчаравалі. Беларусь таксама «закідана» таннай штатаўскай прадукцыяй (якая, дарэчы, спецыяльна вырабляецца для краін «трэцяга свету»), і няма канца гэтаму бездухоўнаму тунелю. Таму трэба як мага хутчэй адчуць сябе еўрапейцамі з вялікай літары.

ГУД БАЙ, АСТАНКІНА!

У красавіку па лініі студыі АБЦ у Мінск павінен прыехаць прадстаўнік вельмі вядомай французскай кампаніі, якая ў свой час абсталявала высокакласнай апаратурай усё Астанкіна. Ён вельмі зацікаўлены менавіта ў нашай рэспубліцы і яшчэ ў Вене цікавіўся палітычнай абстаноўкай на Беларусі. У час прыезду французскага прадстаўніка ў Мінск можа зайсці гаворка аб грандыёзным праекце па пераабсталяванню Беларускага тэлебачання (калі яно ў гэтым зацікаўлена) ці тэлестудыі ў рамках АБЦ. Мы ў Беларусі карыстаемся інфармацыяй Расійскага (астанкінскага) тэлебачання і з еўрапейскай сеткі практычна выключаны. Але Беларусь — незалежная дзяржава, а атрымлівае інфармацыю ў тым выглядзе, які выгадны Расіі. Да таго ж, ходзяць чуткі аб тым, што Расія проста перастане трансліраваць на нашу рэспубліку свае каналы. Гэта значыць, мы застанёмся без карпунктаў у замежных краінах, а ўлічваючы «бяззубасць» Беларускага тэлебачання, — практычна без інфармацыі.

Плюс да гэтага ў рэспубліцы няма дамоўленасцей з краінамі Захаду аб абмене каналамі і праграмамі. Наспявае інфармацыйны голад. Каб яго прадухіліць, трэба вельмі сур'ёзна падысці да вышэйназванага беларуска-французскага праекта. Мы можам атрымаць тэлевізійнае абсталяванне вышэйшага класа, з якім магчыма паспяхова «забіць» тую інфармацыйную яму, што з'явіцца са спыненнем трансляцый з Астанкіна. Вось чаму трэба будзе тэрмінова падключыць да гэтай справы Беларускае тэлебачанне, Міністэрства культуры, Міністэрства сувязі і заканадаўчыя органы ўлады аж да Вярхоўнага Савета РБ. Толькі тады ў аўдыёвізуальнай галіне Беларусь зможа сказаць на вышэйшую ступень.

ЧАМУ МЕНАВІТА АБЦ!

У адрозненне ад традыцый часоў «застою» ад Беларусі на кангрэс паехалі не бюракраты з высокіх пасад, а прадстаўнікі адной анімацыйнай студыі. Нашы аніматары размаўлялі ў асноўным аб сваіх справах, але мелі на ўвазе інтарэсы ўсёй Беларусі, усяго народа, аб чым сведчаць вышэйназваныя праекты. Да таго ж у студыі АБЦ добра разумеюць, што аднаму іх рэалізаваць вельмі цяжка. Зараз галоўная задача — граматна выкарыстаць тыя магчымасці па аўдыёвізуальнаму забеспячэнню, якія адкрыліся для Беларусі. А ў гэтым павінны быць зацікаўлены мы ўсе.

Станіслаў СУЛКОЎСКІ.

ДЛЯ ВАС, ЗАБУДОЎШЧЫКІ



ЭКСПЛІКАЦЫЯ ПАМЯШКАННЯЎ	Плошча, м²
1. Агульны пакой	11,0
2. Спальня	10,0
3. Кухня	7,0
4. Прыхожая	7,0
5. Туалет	1,5
6 і 7. Спальні	па 10,1
8. Веранда	7,1
9. Гараж	18,8
10. Склеп	10,1
11. Гаспадарчае памяшканне	7,9

Дом на любы густ

Працягваем публікацыю праектаў жылых дамоў для індывідуальных забудоўшчыкаў. У мінулую суботу мы азнаёмілі са знешнім выглядам і планам двухпавярховага збудавання для сельскай мясцовасці і горада. Гэта быў домік-віла з лёгкімі, бы ветразі, контурамі.

Сёння праект больш грувасткі. Але, скажам адразу, такі ж зручны. У бюро Галоўмінскархітэктуры (заказчык зноў той жа інстытут «Мінскпраект») гэтаму збудаванню далі такі «код»: 184-000-821. 13.90.

Як бачыце, **перад вамі зноў дом-віла.** Можа быць выкарыстана ў якасці садовага доміка. Пры нязначнай перабудове ператворыцца ў аб'ёмнае збудаванне для пастаяннага пражывання ў горадзе ці раённым пасёлку. Вельмі добра будзе глядзецца на сельскай вуліцы.

Падсобныя памяшканні, жылыя пакоі, месцы для адпачынку размешчаны ў трох узроўнях. Тут ужо аж тры спальні! Зручны квадратны агульны пакой для адпачынку з двума вокнамі. Павялічана ў параўнанні з першым праектам кухня. Уваход ва ўсе гэтыя пакоі — асобны. Дададзім, што і прыхожая даволі значных памераў — сем квадратных метраў.

З першага паверха лесвічка выведзе на мансарду. Мансардай яе назавём для прыкладу, бо ўсе памяшканні, дадаткова ўцяпліўшы, можна выкарыстоўваць і зімою. Тут два спальныя пакоі (абодва па 10 квадратных метраў), веранда, якую зусім нескладана пераабсталяваць пад аранжарэю ці проста цяпліцу.

Ёсць, вядома, падвал. Ён зроблены пад усім домам. У ім удала «ўпісаліся» такія неабходныя для горада і сельскай мясцовасці атрыбуты, як прасторны гараж (18,8 кв. м), склеп з цёплымі сценамі і магчымым выхадам вонкі (зручна, напрыклад, загружаць бульбу), вядома ж, гаспадарчыя «засекі».

Прадуманы магчымасці індустрыяльнага домабудаўніцтва. Фундаменты стужачныя, яны са зборных бетонных блокаў. Сцены — з цэглы. А вось дах двухсхільны. Выкарыстаны драўляныя кроквы.

Праекціроўшчыкі паклапаціліся, **каб зменшыць расходы на ўзвядзенне гэтага кампактнага гмаху.** Патрабуецца 25 тысяч штук цэглы, 50 куб. м. бетону, 8,3 — цэменту. Сталёвых матэрыялаў патрэбна 1,4 т.

Усіх цікавіць кошт. Да «вялікага» падаражання ўсё ўкладвалася ў 21.930 рублёў. Цяпер цэны так імчаць уверх, што праекціроўшчыкі аказаліся ў тупіку. Усё мяняецца штодня. Толькі само будаўніцтва дасць адказ на гэтае нялёгкае пытанне.

Зазначым, што **агульны аб'ём пабудовы** — 378,7 кубаметра. Крышачку менш трэці гэтай лічбы займае падвал. А агульная плошча пабудовы — 99,8 кв. м.

З заўвагамі звяртацца на адрас: 220123, г. Мінск, вул. В. Харужай, дом 13/61, пакой 317. Тэл. 33-74-27.



Не сталі акцыянерамі— станем аўкцыянерамі

Клопатам аб блізкіх прадыктаваны некаторыя рашэнні сесіі Аршанскага раённага Савета. Адзін з дакументаў, напрыклад, загадвае: «...арганізаваць збор, перапрацоўку і рэалізацыю танных, уцэнёных ці былых ва ўжытку адзення і абутку для малазабяспечаных слаёў насельніцтва». Гэта датычыцца тых, хто на схіле гадоў апынуўся на мяжы беднасці. Ну, а для тых, каму ў нас «усё самае лепшае», будуць праводзіцца (і ўжо праводзяцца) аўкцыёны па продажу дзіцячых рэчаў «сэканд-хэндз». Для сем'яў з мінімальным дастаткам падобныя аўкцыёны ледзь ці не адзіная рэальная магчымасць апрануць дзяцей. Да абноскаў «з-за бугра» прыбавіліся яшчэ і такія ж айчынныя. Аднак і яны наўрад ці вырашаць праблему нястачы і недаступнасці з-за дарагоўлі дзіцячага адзення.

А. ХАІНСКІ, БелаПАН.

20 рублёў за літр бензіну плаціць, можа, і не прыйдзецца

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Ці хапае нам сёння закупляемай нафты? Усе памятаюць урадавыя заявы наконт таго, што паліва ў абрэз і што ўсё яно будзе кінута на сяўбу.

— Калі на сесіі Вярхоўнага Савета абмяркоўвалі падрыхтоўку да сяўбы, В. Ф. Кебіч сапраўды заявіў, што для правядзення сяўбы будуць прыцягнуты ўсе рэсурсы. Але гэтыя яго словы многімі былі ўспрыняты не зусім правільна. Хай людзі супакояцца — ніхто не збіраецца адмаўляць у набыцці бензіну аўтааматарам, ставіць на прыкол прыватны транспарт. Тым больш, што і неабходнасці ў гэтым няма. На сакавік мы мелі рэсурсы 235 тысяч тон бензіну, што больш, чым у мінулым годзе, — вельмі добрая лічба. Хапіла ўсім, нават засталося. У красавіку становішча пакуль няпэўнае. З патрэбных для перапрацоўкі 7,5 мільёна тон нафты мы на сёння атрымалі пацвярджэнне толькі на 4 мільёны 230 тысяч тон. Але ўсё роўна мы ўжо маем 190 тысяч тон бензіну, а вёсны для сяўбы патрэбна каля 90 тысяч тон. За сакавік яна ўжо атрымала 104 тысячы тон, атрымае належнае і ў красавіку. Астатнім спажыўцам, уключаючы прыватнікаў, застаецца 100 тысяч тон, і чакаюцца новыя паступленні.

— Тым не менш, заправіцца сёння вельмі складана. Ажыятаж не змяншаецца.

— Так, паляпшэння тут не відаць. Чэргі не змяншаюцца, хоць продаж бензіну трымаецца на звычайным узроўні.

— І зусім не дзейнічаюць нормы водпуску, вызначаныя ў 20 літраў на машыну. Характэрная сітуацыя: выходзяць з машыны ля бензакалонкі 3—4 чалавекі, і кожны бярэ па 20 літраў — касір жа не глядзіць, той самы аўтамабіль на месцы стаіць ці новы пад'ехаў! Потым, калі ёсць дастаткова пустых каністраў, яны падбягуць да касы яшчэ па разу. Глядзіш — не 20, а ўсе 120 літраў заліті. А астатнія вымушаны чакаць. 3—4 гадзіны трэба, каб заправіцца.

— Запасаюцца людзі любой цаной. Лічу, што парадак на заправачных станцыях павінна навесці міліцыя — не так ужо ў нас шмат гэтых станцый, прычым уначы большасць не працуе.

— Так, людзі запасаюцца і маюць, шчыра кажучы, для гэтага ўсе падставы. Колькі будзе каштаваць літр бензіну, калі ўрад Расіі адхіліць нашы прапановы і адпусціць цэны? Называюцца лічбы парадку 17—20 рублёў...

— Ну што вы — гэта зашмат. У 2—3 разы цэны, вядома, вырастуць. Літр АІ-93 павінен каштаваць самае большае рублёў пяць.

— Вы спадзеяцеся, што гэтым абмяжуецца? Але пасля вызвалення цэн на нафту рост цэн на ўсё, і перш за ўсё на яе ж саму, будзе бесперапынным. Даражаюць энерганосьбіты — даражае электраэнергія. Даражае электраэнергія — даражэй абыходзіцца здабыча нафты і вытворчасць нафтапрадуктаў...

— І хімічная прамысловасць, і транспарт, і ўсё наогул. Таму мы хочам знайсці нейкую разумную мяжу, якая б задаволіла абодва бакі.

— Скажыце, калі ласка, як спецыяліст: ёсць у расійскіх нафтавікоў такая жорсткая неабходнасць адпускаць цэны? Альбо галіна магла б яшчэ пратрымацца з дапамогай датацый і г.д., каб не раскручваць інфляцыйную спіраль?

— Калі мы яшчэ ўзімку ўзгаднялі пастаўкі, яны казалі, што ім, каб нармальна існаваць, трэба 3,5 тысячы рублёў за тону нафты. На жаль, усё мяняецца вельмі хутка, і ў першую чаргу — апетыты нафтавікоў. Зараз здаецца, што абмежаваць іх у стане толькі адмова спажыўцоў ад дарагой нафты.

— Але ў такім выпадку яны прададуць яе за мяжу на валюту. Яшчэ лепей.

— Экспарт нафты ўрад Расіі жорстка нарміруе, і кантроль тут належны. Магчыма, таму і ў сакавіку мы працавалі нармальна.

— Калі цэны ўсё ж дасягнуць вышэйшай адзнакі, ці здолее Беларусь захаваць свой узровень спажывання нафтапрадуктаў?

— У год мы спажываем каля 26 мільёнаў тон нафтапрадуктаў. На маю думку, гэтую лічбу без асаблівых праблем можна скараціць за кошт эканоміі энергарэсурсаў да 24 мільёнаў.

— Значыць, многім нашым «гігантам», што будавалі свой дабрабыт на танных энергіі і матэрыялах, давядзецца зацягваць пасы, прывучацца гаспадарыць разумна. Што ж, хоць нейкая карысць ад усіх гэтых эканамічных катаклізмаў.

Гутарыў Аляксандр БЯРСУДСКІ.

ЯК БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ

Выкарыстайце хусткі замест тканіны

БЛУЗОН, ПАШЫТЫ З ХУСТАК, — гэта не толькі модна, прыгожа, утульна і цёпла. Гэта — і выйсце са становішча, калі вам вельмі хочацца мець нешта новае ў гардэробе на цёплы веснавы дзень, а ўсё такое дарагое і тканіны патрэбнай не знайсці. Пашукайце ў сваёй шафе або купіце ў магазіне дзве шарсцяныя хусткі размерам 90×90 см. Апрацуйце іх прасам так, каб яны расцягнуліся ў даўжыню і атрымалі размер 80×100 см. Вядома, замест хустак можна ўзяць мяккае трыкатажнае палатно адпаведных размераў.

Сягніце хусткі напалавіну ў даўжыню і размясціце на іх дэталі наступным чынам. На адной хустцы кройце спінку, дзве пярэднія палавінкі двухшоўных рукавоў і каўнер. На другой — перад, дзве заднія палавінкі рукавоў і манжэты.

Для нагляднасці мы змяшчаем малюнак раскладкі выкройкі на абедзвюх хустках. У дужках указана шырыня пераду. Усё. Можна шыць.

Але яшчэ крыху ўсеўлівасці і цярпення. Блузон будзе асабліва прывабным, эфектным і ў сучасным стылі, калі вы не палянуецеся і ўпрыгожыце яго перад аплікацыяй і вышыўкай. Гэта якраз тое дапаўненне, што робіць наша ўбранне асабліва модным у гэтым сезоне.

Для гэтага вам спатрэбяцца кавалачкі аксаміту, сукна, драпу, атласу адпаведнага колеру, а таксама па 20 г пушыстай тоўстай шарсцяной пражы ружова-бэзавага колеру. Пялёсткі кветак выканайце аплікацыяй з розных кускоў тканіны, а сцяблінны можна зрабіць або аплікацыяй, або з дапамогай вышыўкі кручанымі шнурамі з шарсцяных і шаўковых нітак.

Каб таўшчыня іх была рознай, варыруйце колькасць нітак у шнуры і колькасць шнуроў, укладзеных побач. Шнуры прастрачыце на машыне або прышыйце швом «назад іголку». Канцы шнуроў выведзіце на левы бок і замацуйце ўручную. Такімі ж шнурамі ўпрыгожце валік гарлавіны.

Па аплікацыі і ў месцах, да якіх трэба прыцягнуць увагу, нашыйце ўроссып бліскаўкі, кожную з якіх замацуйце бісерам.

Графічны выгляд вышыўкі вы бачыце на малюнку. Калі ваша фантазія падкажа вам штосьці іншае, — нічога не маем супраць.

Жадаем поспеху!



Матэрыял да друку падрыхтавала Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

НОВАЯ РУБРЫКА Ў ГАЗЕЦЕ

Разам—праз вякі

«РАЗАМ — ПРАЗ ВЯКІ» — так мы вырашылі назваць новую рубрыку ў нашай газеце. Аб чым тут будзе весціся гаворка — здагадацца няцяжка. Здаўна на беларускай зямлі жывуць прадстаўнікі дзесяткаў нацыянальнасцей і вялікіх, і малых, і блізкіх, і далёкіх. Жывуць мірна, дружна ў гэтым вельмі багатым на ўсё добрае краі. Але ці многа мы ведаем пра іх? Адкуль яны, як прыйшлі на Беларусь, якія святы святкуюць?.. Пад гэтай рубрыкай мы раскажам аб святах, якія адзначаюць прадстаўнікі асноўных рэлігійных канфесій на Беларусі: праваслаўныя і стараверы, пратэстанты і каталікі, уніяты і іудзеі, крышнаіты і мусульмане...

Такім чынам, мы пачынаем.

4 КРАСАВІКА мусульмане адзначаюць ІД АЛЬ-ФІТР (УРАЗА-БАЙРАМ). Расказвае намеснік старшыні згуртавання татар-мусульман Беларусі «Аль-Кітаб» Ібрагім КАНАПАЦКІ:

— «Іслам» у перакладзе з арабскай азначае «пакорлівасць». Гэта адна з найбольш распаўсюджаных у свеце рэлігій (паводле звестак Сусветнай лігі, мусульман сёння налічваецца звыш 1 мільярда). Іслам узнік у Аравіі на пачатку VII стагоддзя нашай эры. На землях Беларусі мусульмане сталі аселі ў канцы XIV стагоддзя, калі Вялікі князь Літоўскі Вітаўт запрасіў на вайсковую службу татар. Яны рассяліліся каля Вільні, Мінска, Наваградка, Слоніма, Гродна. Талерантнасць, якая панавала ў ВКЛ, дазваляла татарам будаваць свае мячэці, ствараць татарска-мусульманскія школы. У 1591 годзе тут пражывала каля 200 тысяч татар, якія мелі амаль 400 мячэцяў. Адзін з тагачасных храмаў, пабудаваны ў 1557 годзе каля вёскі Даўбучкі Смаргонскага раёна, захаваўся да нашых дзён і з'яўляецца самай старой драўлянай мячэццю ў Еўропе. У часы Рэчы Паспалітай мусульмане трапілі пад моцны ўплыў каталіцызму, па гэтай прычыне шмат татар пакінула краіну або прыняло хрысціянства. Таму колькасць мусульман к пачатку XVIII стагоддзя зменшылася да 30 тысяч.

На 1939 год беларускія татары мелі 17 мячэцяў і два малітоўныя дамы. Пасля другой сусветнай вайны захавалася адна дзеючая мячэць у г. п. Іўе, якая і зараз застаецца адзінай на Беларусі.

Веравызнанне ісламу выкладзена ў Каране, які быў пасланы ўсемагутным Алахам прароку Мухамеду праз анёла Джэбраіла. Культ ісламу абапіраецца на пяць «стаўпоў веры»: спавяданне веры праз абвяшчэнне формулы «Ля ілляга іллялагу Мухамед расюлюллагу» (няма Бога, акрамя Алаха, Мухамед прарок Алаха), штодзённая пяціразовая малітва (салят), абавязковая дапамога бедным, пост у месяц рамазан (саум), паломніцтва ў Меку (хадж).

У сувязі з тым, што мусульмане карыстаюцца месячным календаром, які на 11 дзён карацейшы за сонечны, то адны і тыя ж святы адзначаюцца на 11 дзён раней, чым у мінулым годзе. Толькі праз 32 гады месячныя святы і пост робяць поўны каляндарны гадавы круг.

4 красавіка пачынаецца Ід аль-фітр (свята разгавення), вядомае больш пад цюркскаю назвай Ураза-байрам. Гэтае свята з'яўляецца заканчэннем посту і працягваецца тры дні (сёлета — 4, 5, 6 красавіка). Вялікі пост рамазан (або рамадан) —абавязковы для ўсіх здаровых дарослых мусульман (тыя, хто часова быў вызвалены ад посту або выпадкова парушыў яго, павінны пасціцца пасля заканчэння месяца рамазан на працягу страчаных дзён). Пост з'яўляецца сродкам для ўтаймавання страсцей, перанятых чалавекам ад жывёлы, удасканальвання духоўных асноў.

Але вось заканчваецца нялёгкае выпрабаванне, радасна і пышна адзначаецца Ураза-байрам. Перад пачаткам свята беднякам, сіротам, жабракам раздаюць міласціну, добраахвотныя ахвяраванні ідуць і на патрэбы мячэці, 2,5 працэнта свайго гадавога даходу мусульманін павінен унесці на карысць абшчыны. У гэты дзень прынята рабіць падарункі жонцы і дзецям. Напярэдадні Ураза-байрама суседзі абменьваюцца традыцыйнымі стравамі. Дома ж збіраюцца ўсе члены сям'і, нікому не дазваляецца далёка адлучацца, бо лічыцца, што ў гэты дзень у дом прыходзяць душы памёршых.

Зранку перад малітваю мусульмане выконваюць усе ачышчальныя цырымоніі, апранаюцца ў святочнае адзенне. «...Бывай, бывай, о месяц пакаяння, прабачэння і вызвалення ад агню і пекла. Я быў вельмі ўзрадаваны, я дажыў да месяца благаславёнага, але сёння, з вачыма, поўнымі слёз, я павінен сказаць сабе: о месяц рамазан, бывай... Сярод журбы, у якую я паглыбіўся, я абзываюся жалобнымі стогнамі, я праліваю крывавыя слёзы. Нягледзячы на маё кволае цела, я ўбачыў твар Твой, з асалодаю і сумам кажу: месяц рамазан, бывай...» Так гаворыцца ў адной з пропаведзей.

Пасля ўрачыстага богаслужэння мусульмане накіроўваюцца на могілкі, каб памаліцца за душы памёршых. У дзень свята прынята віншаваць адзін аднаго: «Таккаббаль Алла мінна уа мінкум» (няхай ухваліць Алах старанні нашыя ў імя Яго). Дзе-нідзе з'яўляюцца імправізаваныя базары і кірмашы, арганізоўваюцца танцы, гулянне моладзі, застоллі, але без алкагольных напіткаў.

Падрыхтаваў Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

ВІНШУЕМ, НАСТАЎНІК І КАЛЕГА!

Выканком Канфедэрацыі журналісцкіх саюзаў Содружнасці Незалежных Дзяржаў падвёў вынікі творчага конкурсу на лепшыя журналісцкія работы 1991 года.

Сярод лаўрэатаў нашага прафесіянальнага спаборніцтва — два прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь. Гэта—прафесар кафедры тэорыі і практыкі журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта Барыс Васільевіч **Стральцоў** і журналіст Павел **Якубовіч.** Першы з іх — настаўнік не аднаго пакалення беларускіх майстроў пяра і мікрафона — атрымаў гэту ўзнагароду за вялікі ўклад у распрацоўку тэорыі друку; на рахунку Барыса Васільевіча звыш дзесяці манаграфій, дзесяткі артыкулаў у перыядычным друку. Другі — за публікацыі ў «Народнай газеце».

Віншуем, лаўрэаты!

Анатоль МЯСНІКОЎ, член выканкома Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь.

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

ДА ЗАБАСТОЎКІ—ЯШЧЭ І ГАЛАДОЎКА

Больш за тыдзень бастуюць шахцёры «Беларускалію». Ціха ў забоях, не працуюць і абагачальныя фабрыкі. Да таго ж пікеты шахцёраў не даюць адгружаць спажыўцам гатовую прадукцыю са складоў. Некалькі шахцёраў, сярод іх і старшыня НПГБ І. Юргевіч, аб'явілі галадоўку, выставіўшы патрабаванні аб падпісанні ўрадам тарыфнага пагаднення і адстаўцы Старшыні Савета Міністраў Вячаслава Кебіча і генеральнага дырэктара аб'яднання А. Падлескага. Як стала вядома, знойдзена магчымасць з 1 красавіка павялічыць калійшчыкам заработную плату ў сярэднім на 50 працэнтаў за кошт змяншэння закупак імпартнага абсталявання і матэрыялаў, рэалізацыі зэканомленай на гэтым валюты на аўкцыёне.

Адміністрацыя аб'яднання вымушана была 1 красавіка выдаць загад аб максімальна магчымым прадастаўленні калійшчыкам водпускаў без захавання заработнай платы з прычыны крызіснага фінансава - эканамічнага становішча, якое выклікана забастоўкай, рэзкім павелічэннем цэн на матэрыялы і паліўныя рэсурсы, стратай рынкаў збыту.

Мікалай ЛОЙКА.

УСЯГО ДВАЦЦАЦЬ ХВІЛІН

з моманту ўгону спатрэбілася міліцыянерам Першамайскага РАУС, каб затрымаць траіх юнакоў (15—17 гадоў), якія раскатваліся па начным горадзе на чужым «жыгулёнку». Прыйдзецца адказваць па ўсёй строгасці Закона.

Застаецца дадаць, што аўтамабіль у тэхнічна спраўным стане вернуты ўладальніку.

Сяргей РАЧЫЛА.

ДВА МІТЫНГІ НА АДНУ ТЭМУ

На плошчу Незалежнасці перад Домам урада 2 красавіка зноў прыйшлі людзі: Мінскі тарадскі стачком і свабодныя прафсаюзы арганізавалі мітынг, прымеркаваны да гадавіны леташніх красавіцкіх падзей.

Другая група людзей на чале, відаць, з небезвядомым Віктарам Чыкіным, пад чырвонымі сцягамі, таксама засведчыла сваёй прысутнасцю цікавасць да такой падзеі. Ужо на самым пачатку мітынгу ўзніклі слоўныя перапалкі, а затым ідэалагічныя праціўнікі дзе-нідзе схапіліся былі і загрудкі, але вельмі хутка ўмяшалася міліцыя, і дзве групы мітынгуючых былі разведзены.

Сустаршыня стачкома Георгій Мухін сказаў, што гэты мітынг — не палітычная акцыя, а агляд сіл працоўных перад веснавым наступленнем. Мы сабраліся, зазначыў ён, каб заявіць, што падзеі красавіка мінулага года не забыты рабочымі, і кіраўніцтва Беларусі таксама павінна памятаць леташнія ўрокі.

На параўнаўча нешматлюдным мітынгу выступілі прадстаўнікі розных прадпрыемстваў сталіцы рэспублікі, гарняцкага стачкома ў Салігорску, народныя дэпутаты.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

На здымках: два мітынгі на адну тэму.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗВАНІЦЕ ВЕЧАРАМ

БРЭСТ. (Ю. Фёдарава). Усім вядома, як цяжка паставіць тэлефон. Аднак вядома і тое, што тысячы тэлефонаў у вячэрні час не выкарыстоўваюцца: тэта тыя, што стаяць ва ўстановах і на прадпрыемствах.

І вось сувязісты Брэста вырашылі размеркаваць магчымасці тэлефоннай станцыі паміж жыхарамі і ўстановамі па-брацку. Днём — тэлефон належыць установе, а вечарам — грамадзяніну. На такі разумны кампраміс згадзіліся пайсці многія. Цяпер на Брэстчыне каля 500 вячэрніх тэлефонаў. Аднак у хуткім часе іх будзе значна больш.

ЧЫЖЭЎСКІЯ ЧЫТАННІ

Тры дні ў горадзе Обнінску Калужскай вобласці працягваліся навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці вядомага вучонага-энцыклапедыста Аляксандра Чыжэўскага.

У іх удзельнічалі каля трохсот студэнтаў інстытутаў, навучэнцаў тэхнікумаў, прафтэхвучылішчаў, школ Расіі, Беларусі, Украіны, Казахстана.

Былі заслуханы і абмеркаваны больш як дзвесце дакладаў па гісторыі, філасофіі, эканоміцы, экалогіі, іншых галінах ведаў.

ПЫТАННІ І КІ

«Аліса» ў Магілёве?

Ці праўда, што будынак Магілёўскага мастацкага музея збіраецца набыць вядомы мільянер Герман Стэрлігаў, гаспадар сістэмы біржаў «Аліса»?

Г. ЛАБОДКА.

г. Орша.

Будынак, у якім зараз знаходзіцца мастацкі музей, раней належаў да аб'ектаў так званай «партыйнай маёмасці», і за яго ўпарта змагаліся гарвыканком і ўпраўленне культуры аблвыканкома. І вось не паспелі музейныя рэліквіі размясціцца ва ўтульных памяшканнях, як газета «Вестник Могилева» паведаміла аб тым, што на злашчасны будынак нечакана зб'явіўся яшчэ адзін прэтэндэнт — сістэма біржаў «Аліса» Германа Стэрлігава. Аднак, як кажуць, чуткі аказаліся значна перабольшанымі. Супрацоўнікі газеты «Могилев-таймс» высветлілі, што прадстаўнікамі «Алісы» назваліся два жартаўнікі — навучэнцы Магілёўскага культасветвучылішча. Аднойчы яны прыходзілі ў музей, які ў той час быў зачынены, і на настойлівыя пытанні вартаўніка: «Чаго тут ходзяць?» і «Хто такія?» — адказалі ў лепшых традыцыях Астапа Бендэра. Быццам бы яны камерсанты з «Алісы» і збіраюцца набыць будынак, цяпер прыехалі паглядзець на яго. Пільны вартаўнік панёс чуткі далей, і ў выніку на іх «клюнула» нават такая паважаная газета, як «Вестник Могилева». Так што спяшаемся супакоіць усіх прыхільнікаў мастацтва горада Магілёва: «Аліса» пакуль не цікавіцца музеем. Затое магілёўскія юнакі яшчэ раз сваім жартам пацвердзілі, што абласны цэнтр нездарма з'яўляецца пабрацімам Габрава.

І мы можам не горш...

Чуў нядаўна па радыё, што ў рэспубліцы ў хуткім часе, магчыма, будзе ўведзена так званая электронная сістэма банкаўскіх разлікаў, якая даўно ўжо прымяняецца на Захадзе. Адпадзе ў такім выпадку патрэбнасць у разліковых чэках, на выпіску ножнага з якіх траціцца не менш за паўгадзіны, знікнуць чэргі ў ашчадных касах і мы ніколі не пачуем у адказ на законнае патрабаванне выдаць уласныя грошы: «Няма ў наяўнасці»... Добра памарыць. Але, сапраўды, хацелася б ведаць, калі ж «электронныя грошы» ў Беларусі стануць рэальнасцю?

П. ЛУПАШЭВІЧ,

Гродна.

У развітых краінах свету з дапамогай банкаўскіх электронных сістэм плацяжоў штогод ажыццяўляецца звыш мільярда аперацый. У хуткасці і эфектыўнасці іх не сумняваецца там нихто. Між тым, як аказваецца, і мы не лыкам шытыя ў гэтай справе. Вучонымі Акадэміі навук Беларусі фактычна ўжо распрацавана тэхналогія аўтаматызаванай банкаўскай сістэмы і разліковых крэдытных картак. Спецыялісты лічаць, што ўкараненнем гэтых навуковых навінак у практыку павінны заняцца нашы кіруючыя органы самага высокага ўзроўню. Аднак адказу на свае прапановы беларускія вучоныя пакуль не атрымалі.

Для вас, чарнобыльцы!

Я эвакуіраваны з 30-кіламетровай зоны. Адкажыце, калі ласка, ці маю я права на льготы? А калі маю, то якія?

В. БЕЛЬЧАНКА.

г. Віцебск.

Такіх пытанняў у рэдакцыю паступае нямала. Вось што па нашай просьбе адказала намеснік начальніка ўпраўлення пенсій і дапамог Міністэрства сацыяльнага забеспячэння рэспублікі Наталля Мікалаеўна КАРП:

— Так, ільготы гэтыя людзі маюць. У адпаведнасці з артыкулам 22 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» тыя, хто эвакуіраваўся і самастойна пакінуў пасля аварыі 30-кіламетровую зону, вызлабяняюцца ад уплаты падаткаў на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных. Ад падатку выслабяняюцца таксама муж ці жонка эвакуіраванага.

Гэтыя асобы маюць таксама права на дадатковы адпачынак без захавання заработнай платы тэрмінам да двух тыдняў у год.

Варта зазначыць, што ў выпадку ўзнікнення пытанняў аб падатках лепш за ўсё звярнуцца ў фінансавыя органы, а па пытанню прадастаўлення адпачынку — у Дзяржкампрацу.

Тлумачэнні аб статусе ўдзельніка ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС можна атрымаць у Дзяржкамчарнобылі РБ (г. Мінск, вул. К. Маркса, 45/4).

Выкупляйце і не хвалюйцеся

У нашай сям'і 7 чалавек. Мы з жонкай, сын з нявесткай, і тры іх дачкі пражываем у двухпакаёвай кааператыўнай кватэры. Стаім у нашым ЖБК на расшырэнне. І вось вырашылі выкупіць жыллё ў прыватную ўласнасць. Але хвалюе пытанне, адказ на якое не ведаем. Ці будзем мы мець пасля выкупу права на расшырэнне?

А. АЛЯКСЕЕЎ, г. Мінск.

Члены ЖБК, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, забяспечваюцца жылымі памяшканнямі на грамадскіх асновах. Гэта правіла распаўсюджваецца і на грамадзян, якія купілі кватэры ў доме дзяржаўнага або грамадскага жыллёвага фонду, ці поўнасцю выплацілі пайвы ўзнос у ЖБК. Таму ў вас ёсць права на паляпшэнне жыллёвых умоў і пасля набыцця ва ўласнасць кватэры ў доме ЖБК.

Справа расследуецца...

Чытала, што ў Віцебску супрацоўнікі спецроты міліцыі маюць дачыненне да гібелі студэнта Баранава. Як развіваецца справа далей?

Ж. ЗОРЫНА.

Мінскі раён.

Сапраўды, вось ужо колькі часу Віцебск не можа супакоіцца ў сувязі з трагічнай смерцю юнака. На сустрэчы са студэнтамі Віцебшчыны ў педагагічным інстытуце старшыня абласнога Савета народных дэпутатаў У. Кулакоў выслухаў патрабаванні прадстаўнікоў ВНУ і тэхнікумаў. А яны былі катэгарычнымі.

Па-першае, стварыць камісію для расследавання гібелі А. Баранава і ўключыць у яе састаў прадстаўнікоў студэнцтва. Па другое, разгледзець справу на адкрытым працэсе. І яшчэ — расфарміраваць падраздзяленне спецыяльнага прызначэння. Старшыня аблсавета запрасіў да размовы работнікаў праваахоўных органаў.

Па словах пракурора Віцебскай вобласці М. Шахметава, стварыць спецыяльную камісію, як таго патрабуюць студэнты, няма патрэбы, бо гэта не прадугледжана законам, а справу расследуе следчы па асабліва важных справах пры Генеральным пракуроры Рэспублікі Беларусь.

А старшыня абласнога суда Б. Невідовіч запэўніў, што працэс абавязкова будзе адкрытым, і нават дазволіў выступіць на ім грамадскаму абвінаваўцу ад студэнцтва.

Што датычыцца расфарміравання падраздзялення спецыяльнага прызначэння, то ў ім зараз працуе спецыяльная камісія, якая зробіць аб'ектыўныя вывады.

Гордан БРУК-ШЭПЕРД

ЛЕС ПЕРАБЕЖЧЫКА

Дакументальны расказ пра жыццёвы шлях савецкага разведчыка, які пачаўся ў Бабруйску, а закончыўся ў Кліўлендзе.

(Працяг. Пачатак у №№ 65—69).

Ён вырашыў паспрабаваць неадкладна апублікаваць сваю працу, нягледзячы на тое, што гэта адразу ж выкрые яго інкогніта і, без сумнення, прынясе яму мноства складанасцей. Але і ён, і Марыя да гэтага часу былі ўпэўнены, што іх маці напэўна ўжо няма ў жывых, і парушэнне зароку маўчання цяпер не магло пашкодзіць нікому, акрамя самога Арлова. Апроч таго, кніга, у якой выкрывалася сталіншчына, магла б аказацца магутнай зброяй у ідэалагічнай «халоднай вайне».

Спяшацца з апублікаваннем кнігі прыходзілася таксама па больш празаічнай — але ад гэтага не менш важнай — прычыне. Грошы, якія мелі Арловы, заканчваліся. Калі друкаваліся на машынцы апошнія раздзелы рукапісу, ім ужо прыйшлося сесці на негетарыянскую дыету.

Адна за другой былі прададзены ўсе большменш каштоўныя рэчы, якія былі ў доме. На грошы, вырученыя ад продажу апошняй з такіх рэчаў — Верынага фотаапарата, Арлоў адправіўся ў Нью-Йорк, захапіўшы з сабой толькі што закончаны рукапіс.

У Нью-Йорку ён звярнуўся за парадай да Макса Істмена, вядомага амерыканскага літаратара. Арлоў на ўсякі выпадак трымаўся з гэтым чалавекам, якога раней не ведаў, крайне асцярожна. Ён прадставіўся не як аўтар рукапісу, а толькі як «даверараная асоба» аўтара. Разгадаў Істмен гэтыя хітрыкі ці не, невядома. Больш істотна тое, што ён адразу прызнаў рукапіс «выдатным». Але, працягваў Істмен, яе аўтар, генерал Арлоў, безумоўна, патрабуе кваліфікаванага перакладчыка. Дык вось, ён, Істмен, гатовы ўзяць на сябе працу па перакладу такога выдатнага дакумента на англійскую мову. Яго ўмовы сціплыя: адна трэць ганарара.

Я думаю, нават прафану зразумела, што гэтая прапанова папахвала адкрытым грабяжом. Арлоў раздумваў дзень ці два, але затым рашуча адхіліў падобнае супрацоўніцтва і вярнуўся дамоў у Кліўленд. Узяўшы некалькі сот долараў у доўг у сваіх нью-йоркскіх сваякоў, ён вырашыў, што няхай лепш яго зноў чакае на працягу некалькіх месяцаў бедны вегетарыянскі абед, але ён сам перакладзе сваю працу на англійскую мову.

Летам 1952 года пераклад быў нарэшце закончаны, і ў лютым 1953 года Арлоў паспяхова правёў перагаворы аб публікацыі шэрагу раздзелаў сваёй кнігі ў папулярным часопісе «Лайф». Узнагароджанне здалося яму простатакі казачным.

Публікацыя супала з раптоўнай смерцю Сталіна — галоўнага персанажа арлоўскай кнігі. Яе аўтар быў нават некалькі расчараваны, што Сталін не ўбачыў, як тайная гісторыя яго злачынстваў, зрабілася вядомай усяму свету і ўсе намаганні ўтаіць іх аказаліся дарэмнымі. Але, з другога боку, смерць Сталіна зноў прыкавала ўвагу ўсяго чалавецтва да асобы гэтага тырана, і публікацыя арлоўскіх выкрыццяў аказалася вельмі дарэчы.

У тым жа годзе кніга Арлова пад назвай «Тайная гісторыя сталінскіх злачынстваў» была поўнасцю апублікавана на англійскай мове нью-йоркскім выдавецтвам «Рэндом хаус». Яе пераклалі на нямецкую, японскую, кітайскую і іншыя мовы. Гэта было першае падрабязнае і аўтарытэтнае даследаванне падзей, якія адбываліся за кулісамі сталінскіх «чыстак» і праславутых маскоўскіх «паказальных працэсаў». Арлову ў поўнай меры ўдалося прадэманстраваць усяму свету бязмежную подласць, мегаламанію, помслівасць, каварства і жорсткасць Сталіна і яго памагатых — тыя рысы савецкіх кіруючых вярхоў, што на працягу дзесяцігоддзяў вызначалі ўнутраную — ды і знешнюю — дзяржаўную палітыку вялікай краіны і выклікалі на Захадзе спачатку толькі неўразуменне, змешанае з недавер'ем.

Такім чынам, у лютым 1953 года адзін з вядучых амерыканскіх часопісаў, штотыднёвік «Лайф», пачаў рыхтаваць да публікацыі асобныя раздзелы з кнігі Арлова і друкаваць іх з нумара, датаванага 6 красавіка.

Цяпер спахапіліся і ФБР, з вялікім спазненнем устанавіўшы, што на працягу цэлых пятнаццаці гадоў пад бокам у амерыканскай контрразведкі бесклапотна жыў кампетэнтны спецыяліст па пытаннях савецкай падрыўной дзейнасці і шпіянажу.

З таго дня як першы артыкул Арлова з'явіўся ў штотыднёвіку, што называецца, шчыльна за яго ўзяліся і не выпускалі са сваіх «абдымкаў» некалькі тыдняў запар. Агенты ФБР літаральна днявалі і начавалі ў яго цяперашняй нью-йоркскай кватэры, задаючы гаспадару мільён пытанняў, — яго дасье расло, складаючы ўжо горы спісанай паперы.

Дарэчы, уся гэта валтузня аказалася крайне малаэфектыўнай, асабліва калі справа датычыла інфармацыі, што выходзіла за рамкі асабістай біяграфіі Арлова. Тут ён наадрэз адмаўляўся адказваць на якія б там ні было пытанні. Гэта быў не той узровень, на якім ён пагаджаўся цяпер супрацоўнічаць з амерыканскім урадам.

ФБР, відаць, зразумела, што нават у «лепшыя» (гэта значыць у самыя цяжкія для Арлова) часы яго наўрад ці ўдалося б спакусіць супрацоўніцтвам за грошы. А ўжо цяпер і тым больш. Яму не патрэбны былі больш грошы. Яго даход ад кнігі і ад артыкулаў у «Лайфе» склаў у 1953 годзе, як пазней удалося ўстанавіць, 44.500 долараў — амаль удвая больш за тую суму, на якую яны з жонкай жылі паўтара дзесятка гадоў. Усё, што яму цяпер патрабавалася, — гэта каб яго пакінулі ў спакоі і далі магчымасць легальна жыць у гэтай благаславеннай краіне.

Але якраз у гэтым яму і збіраліся адмовіць. Як вынікае з пратакола пасяджэнняў кангрэса Злучаных Штатаў, 13 чэрвеня 1955 года былі выпісаны ордэры на арышт абодвух — мужа і жонкі — на той падставе, што яны быццам бы «парушылі правілы, устаноўленыя для асоб, якія не маюць статуса легальных імігрантаў». Акрамя таго, Арлову інкрымінавалася яшчэ адно парушэнне: сцвярджалася, што ён «будучы іншаземцам, пасля ўезду ў ЗША працягваў заставацца членам камуністычнай партыі замежнай дзяржавы» (?!). Гэта фармулёўка, яўна народжаная тагачасным макартысцкім псіхозам, была надзвычай няўклюднай і недарэчнай па сутнасці. Таварыш Фельдбін, ён жа Арлоў і як яго там яшчэ, напэўна ж быў няўмольна выкраслены са спісу членаў ВКП(б), як толькі ў Маскве стала вядома аб яго ўцёках, гэта значыць задоўга да таго, як ён перасёк граніцу Злучаных Штатаў.

На шчасце, гэтыя, мякка кажучы, неінтэлігентныя дзеянні, інспіраваныя ФБР, не мелі вынікаў. Выхад кнігі Арлова стаў свайго роду літаратурнай сенсацыяй і прыцягнуў да яго ўвагу шырокіх колаў амерыканскай грамадскасці, якая рашуча выступіла ў яго абарону. Справа скончылася тым, што спецыяльным білем, праведзеным праз кангрэс у маі 1956 года, мужу і жонцы Арловым было афіцыяльна прадастаўлена права пастаяннага пражывання на тэрыторыі Злучаных Штатаў Амерыкі.

За восем месяцаў да гэтай падзеі Аляксандр Арлоў, якога суправаджала жонка, упершыню даў паказанні перад сенацкім падкамітэтам па нацыянальнай бяспецы. У лютым 1957 года муж і жонка зноў паўсталі перад членамі гэтага падкамітэта. Іх паказанні былі апублікаваны толькі праз шаснаццаць гадоў.

Паказанні, дадзеныя Арловым на сенацкіх слуханнях, былі ўвогуле вельмі стрыманымі. Калі размясціць іх у храналагічным парадку, акажацца, што, па сутнасці, Арлоў раскрыў вельмі нямногае звыш таго, што ўдалося выцягнуць з яго супрацоўнікам ФБР у самым пачатку расследавання.

Цёмная гісторыя, ускрытая цяпер з дапамогай Арлова, адносілася да шырока задуманай Саветамі кампаніі па наваднленню Злучаных Штатаў фальшывымі грошамі. Справа датычыла 1928—1934 гадоў. Паведамленні аб з'яўленні ў той перыяд масы фальшывых банкнот сапраўды мільгалі ў амерыканскай прэсе, але ў далейшым Масква, пераканаўшыся, што аперацыя ганебна праваліласся, прыняла экстраныя меры да яе згортвання і замятання слядоў. Аднак да выкрыццяў, зробленых Арловым, ніхто не ведаў, якіх вялікіх маштабаў - павінна была дасягнуць гэта акцыя, каб усё ішло, як задумалі яе арганізатары, і ў якой меры яе ініцыятарам і натхніцелем быў асабіста Сталін. Цяпер гэтыя нікантныя падрабязнасці яго дзейнасці зрабіліся здабыткам галоснасці.

Уся гэта афера, паводле сведчання Арлова, была задумана для таго, каб, па-першае, шляхам размену фальшывых купюр на сапраўдныя раздабыць больш цвёрдай валюты, якой бальшавікам вельмі не хапала, і такім чынам забяспечыць закупку прамысловага абсталявання, неабходнага для індустрыялізацыі Савецкай дзяржавы. Па-другое, Саветы спадзяваліся падарваць амерыканскую эканоміку.

Сталін з самага пачатку быў галоўнай спружынай гэтай авантуры. На думку Арлова, такая ідэя выспела ў галаве правадыра зусім невыпадкова: яшчэ ў 1908 годзе арыштаваны за падпольную рэвалюцыйную дзейнасць будучы дыктатар трапіў у адну камеру з двума вядомымі фальшываманетчыкамі, спецыялістамі па падробцы пяцісотрублёвых банкнотаў, і праявіў вялікую цікавасць да іх расказаў.

Эксперты дзяржаўнага банка Злучаных Штатаў сцвярджалі, што ім ніколі яшчэ не даводзілася бачыць фальшывыя банкноты, выкананыя з такім майстэрствам. Здзіўляцца гэтаму не прыходзіцца: Арлоў растлумачыў, што па распараджэнню Сталіна іх выраб быў даручаны маскоўскаму Дзяржзнаку, гэта значыць той установе, дзе распрацоўваліся і выпускаліся савецкія банкноты і дзе былі сканцэнтраваны лепшыя ў СССР спецыялісты ў гэтай галіне — гравёры і друкары. Гэтыя кадры захаваліся ў значнай меры яшчэ з царскіх часоў. А банкноты царскай Расіі, заўважаў Арлоў, па малюнку і па якасці друку былі найбольш дасканалымі ў свеце.

(Заканчэнне будзе).

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

△ Б. Ельцын не растлумачыў прычын замены Гайдара на пасадзе міністра фінансаў. Але, як вядома, праграма рэформ Гайдара выклікала шмат крытыкі. І таму не выпадкова яго вызваленне адбылося напярэдадні з'езда дэпутатаў Расіі. Чакаецца, што многія з іх будуць крытыкаваць палітыку ўрада.

△ **Афіцэры 14-й арміі СНД, якая размяшчаецца ў Прыднястроўі, вырашылі не прымаць актыўных дзеянняў да завяршэння перагавораў у Кішынёве. Але армія можа быць прыведзена ў баявую гатоўнасць у любы момант.**

△ Сусветны банк заявіў, што у былым СССР у бліжэйшыя два гады не будзе істотнага павелічэння вытворчасці прадуктаў харчавання. Іх былым савецкім рэспублікам давядзецца экспартаваць штогод на суму ў 11 мільярдаў долараў. Сусветны банк падкрэслівае, што для таго, каб забяспечыць вытворчасць асноўных прадуктаў харчавання, неабходны радыкальныя рэформы ў сельскай гаспадарцы і ў сістэме забеспячэння.

△ **Расія запытала ў Эстоніі інфармацыю па асноўных раздзелах новага закона аб грамадзянстве. На думку Расіі, шэраг палажэнняў закона, калі іх прымяніць, могуць парушыць правы неэстонскага насельніцтва. Напрыклад, прадастаўленне грамадзянства тым асобам, якія мелі яго да савецкай акупацыі Эстоніі ў 1940 годзе і іх патомкам незалежна ад нацыянальнасці.**

△ Кіраўнікі разведак краін Заходняй і Усходняй Еўропы хутка правядуць у Сафіі трохдзённую канферэнцыю. Яны будуць абмяркоўваць ролю разведкі ва ўмовах дэмакратыі. Абмен думкамі будзе тычыцца такіх праблем, як грамадзянскі нагляд за дзейнасцю разведвальных службаў, правы чалавека і новыя абавязкі падобных службаў.

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

△ **У сектары Газа ізраільскія салдаты адкрылі агонь па ўдзельніках дэманстрацый пратэстаў. Як паведамілі арабы, 18 палесцінцаў паранены.**

△ Спецыяльны пасланнік ААН Б. Севаш аптымістычна ацаніў перспектывы мірнага ўрэгулявання ў Афганістане ўжо ў красавіку. Аб гэтым ён заявіў журналістам у Ісламабадзе пасля вяртання з Кабула, дзе прайшлі яго перагаворы з прэзідэнтам Наджыбулой.

△ **Каля 50-ці нямецкіх нацыяналістаў правялі дэманстрацыю перад нямецкім пасольствам у Варшаве. Яны пратэставалі супраць візіту Л. Ваденсы ў Германію, а таксама, па іх словах, супраць сённяшняй акупацыі Польшчы Германіяй.**

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

△ Кандыдат у прэзідэнты ЗША Б. Клінтан раскрытыкаваў Дж. Буша за тое, што ён працягвае падтрымліваць вельмі старых кіраўнікоў Кітая, у якіх алергія на дэмакратыю і правы чалавека. ЗША маглі дазволіць сабе гэта ў час «халоднай вайны», калі Кітай разглядаўся як стратэгічная процівага СССР, але не цяпер. Сёння няма патрэбы разырываць кітайскую карту, сцвярджае Б. Клінтан.

△ **Як гуманныя і адукаваныя лідэры становяцца дыктатарамі і дэспатамі? Яны, на погляд аднаго амерыканскага вучонага, становяцца ахвярамі тыранскага тыпу. Кожны вялікі таленавіты кіраўнік прыходзіць да высновы аб неабходнасці радыкальных перамен, але на шляху да іх ажыццяўлення пад уплывам розных абставін паступова пераўтвараецца ў крыважэрнага дэспата. Прыклад рымскага імператара Нерона, які пачынаў сваё праўленне з гуманных крокаў, таксама сведчыць аб гэтым. У момант найвышэйшага ўзлёту кіраўніком авалодвае манія велічы, чаму спрыяюць яго прыбліжаныя, і якія ж потым садзейнічаюць звяржэнню лідэра.**

△ У сталіцы Лівіі шэраг пасольстваў падвергліся нападу раз'юшанага натоўпу. Дэманстранты разграмілі будынак пасольства Венесуэлы, якая зараз з'яўляецца старшынёй Савета Бяспекі ААН, каля расійскага пасольства былі падпалены некалькі аўтамабіляў. Такім чынам лівійцы пратэставалі супраць увядзення санкцый ААН адносна іх краіны.

△ **У баях з прыхільнікамі звергнутага прэзідэнта Грузіі Гамсахурдыя ў горадзе Поці загінула 14 чалавек.**

△ У былых мусульманскіх рэспубліках гучаць галасы за тое, каб ім аб'яднацца ў адну дзяржаву накшталт ранейшага Туркестана. Некаторыя палітыкі лічаць, што бальшавіцкае раздзяленне Сярэдняй Азіі на рэспублікі вельмі пашкодзіла яе насельніцтву. Гэта быў працяг імперскай палітыкі Расіі. Але ім пакуль лепш развівацца паасобку, а потым, магчыма, аб'яднацца.

Непальскі гараскоп на наступны тыдзень

КАТМАНДУ. (Перадае Сяргей Буланцаў). КАЗЯРОГА паглынула мноства спраў. Не спяшайцеся адмаўляцца ад сваёй цяперашняй. Сітуацыя неўзабаве значна палепшыцца. Можаце смела накіроўвацца ў камандзіроўку—яна прынясе добрыя вынікі. Астролаг рэкамендуе прысвяціць суботу 11 красавіка сустрэчы з блізкімі сябрамі.

ВАДАЛЕЮ, відаць, прыбавяць зарплату, але менш, чым чакалася. Не крыўдуйце і памятайце, што ў вас магутныя апекуны — Сатурн і Уран. На гэтым тыдні яны асабліва спрыяюць студэнтам і спартсменам. Дома вы цалкам кантралюеце абстаноўку.

У РЫБ працягваецца спрыяльны перыяд. Тыя, хто не па сваёй волі апынуліся ў бестэрміновым адпачынку, зноў будуць запрошаны на работу. Служачыя старэйшага пакалення атрымаюць ільготы. Даволі моцныя рамантычныя тэндэнцыі. Вы пераканаецеся ў гэтым 10 і 11 красавіка.

Калі ў АВЕНА выспелі новыя планы і праекты, лічыць астролаг, можна пачынаць іх ажыццяўленне, а 11 красавіка— лепшы для гэтага дзень. Планеты спрыяюць асобам творчых схільнасцей. Жанчынам сярэдніх гадоў трэба паказацца ўрачу.

ЦЯЛЬЦА могуць паспрабаваць перацягнуць на іншую работу абяцаннямі высокай зарплаты. Астролаг мяркуе, што вы зробіце ранавую памылку, калі паддадзіцеся на ўгаворы. У выхадныя дні сямейным парам нядрэнна выбрацца куды-небудзь за горад.

БЛІЗНЯТЫ вырашаць на сваю карысць нейкую даўнюю спрэчку. Вам гарантуецца поспех у любым відзе спаборніцтваў. Магчымы пажаданы для абодвух бакоў раз'езд з бацькамі. Блізкі сябар пазнаёміць вас з аднадумцам, Каханне дорыць прыемныя сюрпрызы.

РАКУ ў канцы тыдня можа вельмі пашанцаваць. Не расхаладжвайцеся перамогай, а бярыцеся за справу: вецер удачы можа змяніць напрамак. У сям'і захаваецца адносны спакой.

У ЛЬВА на гэтым тыдні чатыры спрыяльныя дні. І тым не менш ён не ахаваны ад непрыемнасцей. Ні ў якім разе не пакідайце кватэру без нагляду. Не зніжайце высокага тэмпу работы. 10 красавіка прынясе вам нейную прыемную перамену.

ДЗЕВЕ астролаг пакуль што не раіць пачынаць новую работу. Разбярыцеся са старымі справамі, каб стварыць плацдарм поспеху на наступным тыдні. Удзяліце максімум увагі бацькам і блізкім.

ШАЛЯМ могуць прапанаваць занятак, звязаны з выпускам новага друкаванага выдання. Медыцынскія работнікі, юрысты, архітэктары і інжынеры — у асаблівым фаворы ў планет. Вашы лепшыя дні— 10 і 11 красавіка.

СКАРПІЕНА астролаг заклікае не слухаць дарадцаў, якія пераконваюць вас, што вы нібыта ўпустую растрачваеце свой талент. Гэтыя людзі дабіваюцца ўласных мэт, спрабуючы збіць вас з панталыку. Не адступайце, нават калі адчуеце нейкае расчараванне. Хутка вы дасягнеце жаданага.

У СТРАЛЬЦА напярэдадзе дзелавая сустрэча, якая адбудзецца 7 красавіка. Не забудзьце апрануць што-небудзь жоўтае ці ружовае, і вашы шанцы на поспех павялічацца. Старанна ацаніце ступень рызыкі. Музыканты і мастакі апынуцца ў цэнтры грамадскай увагі.

ЗАГАДАНА БЫЦЬ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНЫМІ...

Як хутчэй выйсці са сваёй прадукцыяй на сусветны рынак? Што для гэтага трэба зрабіць? Чаму яна на сённяшні дзень неканкурэнтаздольная?

На гэты конт трымаюць у Савеце Міністраў, перад камісіяй на чале з намеснікам прэм'ера М. Косцікавым, справаздачу кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў. Прычым, у аснову той прадукцыі, якая павінна рушыць нашу эканоміку ў сусветны рынак, пакладзена машынабудаванне, а агледзіны зроблены спачатку для тых галін, якія ўплываюць на яго, г. зн. для станкабудавання, прыборабудаўнічай прамысловасці і г. д. На базе ўказаных справаздач, меркаванняў, якія паступаюць, намечана выпрацаваць адпаведную праграму...

Што ж, справа застанецца толькі за той самай канкурэнтаздольнасцю.

ЧЫСТЫ ЧАЦВЕР

ТАЛАЧЫН. (Т. Махтадуй). З наступленнем цёплых дзён кожны чацвер на вуліцы горада ў канцы рабочага дня выходзяць працоўныя калектывы прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і школ. Ідзе ўборка дарог, паркаў, сквераў.

Такое рашэнне прынята гарсаветам у мэтах навядзення парадку ў райцэнтры, які сёння знаходзіцца далёка не ва ўзорным стане. Камунальная служба, як гэта ўжо амаль паўсюдна стала нормай, не забяспечвае чысціні і належнага санітарнага стану ў месцах пражывання людзей. Вось і вымушаны ўсе ўзяць у рукі венікі. Не застаюцца ў баку і работнікі гарсавета.

Праграма тэлеперадач

ТЭЛЕБАЧАННЕ

4 красавіка

Беларускае тэлебачанне

11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Фільм — дзецям. «Духавілдзец».
12.45. Кім становяцца чэмпіёны. Спартыўна-музычная праграма.
13.35. «Ромка, Фомка і Артос». Фільмы 1, 2, 3-ці. «У старой скрыні». «Следства вядуць Калабкі». Мультфільмы.
14.35. «Зачараванне рамансам». Фільм-канцэрт.
15.25. Праблемы сучаснай вёскі.
16.10. «Смерць манекеншчыцы». Мастацкі фільм з субцітрамі.
17.30. Без пяці 18. Праграма для падлеткаў і бацькоў.
18.00. Мерыдыян. На зямлі Міжрэчча.
18.45. «Тэатр адной паэмы». Янка Купала. «Курган».
18.55. Запрашаем на дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Зала лаўраратаў. Сустрэча з заслужаным артыстам Беларусі Г. Забарам.
20.10. Мультфільмы для дарослых «Нараджэнне таленту». «Стрэлачнік».
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Свята «Суперкнігі». Інфармацыйна-гуманітарная праграма Хрысціянскага тэлебачання «Сі-Ві-Эн» (ЗША).
22.00. Мастацкі фільм «Палёт над гняздом зязюлі». 1-я серыя.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

11.35. Фільмы-балеты Ф. Слідоўкера і А. Тафеля. «Ідыёт».
12.30. Дак. фільм «Маскоўская элегія».
14.00. Навіны.
14.20. Да вынікаў міжнароднага тэлемарафона. «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
14.50. Мастацкі фільм «Маара».
16.10. Чырвоны квадрат.
16.50. «Пчала Мая».
17.15. Шчаслівы выпадак.
18.15. Мастацкі фільм «Жанчына ў капелюшы» (Польша).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Па той бок рампы. Сентыментальнае падарожжа У. Сашальскага.
21.40. Да і пасля поўначы.

Канал «Расія»

12.00. Пілігрым. Расійскае бюро падарожжаў.
12.45. Савелій Ямшчыкоў у праграме «На рагу «Праўды» і Ямскога поля».
13.00. Весткі.
13.20. «Юнацтва Пятра». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
14.30. Антракт: група «Апошні шанц».
14.45. М-Трэст.
15.15. «Іслам у Расіі.»
15.45. Залатая шпора.
16.45. Познер і Донах'ю.
17.40. Парламенцкі веснік Расіі.
17.55. Мультфільм «Прыгоды Боска».
18.25. Іграе віяланчаліст В. Пергаменшчыкаў.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Кабарэ «Вязглуздзіца».
20.30. «З каханымі не расстаўвайцеся». Мастацкі фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Праграма «А».
23.25. Пецярбургскі міф. «Я ішоў да цябе...». С. Надсан.

5 красавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вацькі і дзеці». Мастацкі фільм. 4-я серыя.
9.55. «Балахнінскія карункі» Кінанарыс.
10.05. Родные слова.
10.50. «12 песень у студыі». Кампазітар А. Елісеенкаў.
11.40. «Адорваць людзей дарагіх...» Народныя ўмельцы Уздзенскага раёна.
12.20. Для школьнікаў. Падказкі на манжэтах.
13.00. НІКа. Нядзельны дадатак.
13.45. У. Гібсан. «Тая, што стварыла цуд». Спектакль Разанскага ТЮГа.
15.35. Кінаэкран-92. Красавік.
17.05. Сістэма «Ньюс».
17.25. Працяг размовы. Наш госць — начальнік Беларускага ўпраўлення УС на транспарце генерал-маёр міліцыі пісьменнік М. І. Чаргінец.
18.15. Тэлебом. Конкурсная музычна-забаўляльная праграма для дзяцей.
18.55. Запрашаем на дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Канцэрт па заяўках работнікаў Барысаўскай фабрыкі макаронных вырабаў.
20.05. «Табольская разная косць». Дак. фільм.
20.25. Калыханка.
20.45. Мастацкі фільм «Палёт над гняздом зязюлі». 2-я серыя.
22.15. «Белы сон». Музычны фільм.

І канал. Астанкіна

9.25 Раніцяная зорка.
10.15 «Вясёлка». «Стварэнне прыгажосці» (Тайланд).
10.30 Пад знакам «Пі».
11.20 «Калі ласка, не пляткарце, пагавары пра У. Маякоўскага».
12.05 Мастацкі фільм «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
12.55 Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. У перапынку — Навіны.
14.50 Клуб галоўных рэдактароў.
15.15 Новае пакаленне выбірае.
16.05 Клуб падарожнікаў.
16.55 Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45 Навіны.
18.00 Тэлеэлюсія.
18.10 Сцэнарый для Парнаса.
18.40. ТБ «Нява». Хто з намі?
19.00 Мастацкі фільм «Паліцэйскі па найму» (ЗША).
21.00 Вынікі.
21.45 Тэатр двайнікоў.
23.00 Навіны.
23.25 «Начное казіно».
00.05 «Ах, вадэвіль, вадэвіль...» Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

9.05 Хочаце, верце... Тэлевіктарына.
9.35 Паралелі. «У светлай пячоры...»
10.00 «Суперкніга». Мультфільм. 7-я серыя.
10.25 Аты-баты... «За Радзіму, за веру».
10.55 Тэлеасамблея.
11.40 Эскулап.
11.50 «Юнацтва Пятра». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
13.00 Весткі.
13.20 Візаві. Знаёмства з амерыканскім кінаржысёрам Олівэрам Стоўнам.
13.50 Белая варона.
14.35 Прэзентацыя радыё «Свабода» ў ЦДЛ.
15.40 «Ноч». «Падаронка». Мультфільмы.
16.00 У свеце жывёл.
17.00 Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
18.00 Момант ісціны. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае Мая Плісецкая.
19.00 Весткі.
19.20 Свята кожны дзень.
19.30 Мастацкі фільм «Магі». Фільм 5-ы «Маленькая аб'ява».
20.00 Тварам да Расіі.
20.20 «Клоун-шоу».
21.10 Антракт: спявае Максім Фадзееў.
21.25 Трэцім будзеш?
22.00. Весткі.
22.20 Спартыўная карусель.
22.30. «Блазан». Мастацкі фільм.
00.10 Рок-кафэ.

6 красавіка, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. Беларуская літаратура. 6 клас.
17.00. «Маўглі». Мультфільм. 1-я, 2-я, 3-я серыі.
18.00. Гаспадар. Калгаснае і фермерскае поле — клопат агульны. Мастоўскі раён.
18.25. Іншы экран. Пазнавальна - разважальная праграма.
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Брэст).
19.35. Наш каментарый. «Вы нам пісалі...»
19.45. Сустрэча з працаўнікамі Смаргонскага завода аптычнага станкабудавання.
20.25. Калыханка.
20.50. Тэлепраграма «Культура».
21.45. Спартыўны тэлекур'ер.
22.10. Тэлепраграма «Вёсачка».
22.45. НІКа.
23.00. Нашы госці. Ансамбль салістаў «Рускі фестываль».

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
17.00. Навіны.
17.20. Футбольны агляд.
17.50. НЭП.
18.20. Маст. фільм «Папугай», які гаворыць на ідыш».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. «Новая студыя прадстаўляе: Аўтарскае тэлебачанне; Прэс-клуб; Царкоўная музыка.
23.00. Навіны.
23.25. Шмат музыкі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Італьянская мова.
8.55. Адкрыццё З'езда народных дэпутатаў Расіі.
11.00. Вольны час. «Калекцыянер».
11.15. «З каханымі не расставайцеся». Маст. фільм.
12.40. Сельскі штотыднёвы веснік.
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. Міжнародная сустрэча па амерыканскаму футболу. «Зоркі Расіі» — «Грын Тэрэрз» (ЗША).
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Вольны час. «Калекцыянер».
17.15. А. Бразаўскас. «Ці дапаможа нам Захад?»
17.30. «Звон» (Мурманск).
18.00. «Санта-Барбара». 31-я серыя.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Пятае кола.
21.00. Дзённік З'езда народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. Дзённік З'езда народных дэпутатаў Расіі.
23.30. «Бенефіс» успамінае...»

7 красавіка, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рыбка плавае па дне». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 6 клас.
9.30. «Ева на трэцім паверсе». Маст. фільм.
16.30. Беларуская літаратура. 11 клас.
17.00. «Маўглі». 4-я і 5-я серыі. «Вялікая страла». Мультфільмы.
18.00. «Мужчынскія рамёствы». Дак. фільм.
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Тэхналогія страху».
19.40. Эканамічная хваля. Банк за аблігацыі грошай не дае. Прамая лінія. У перапынку (20.25) — Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.15. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі.
21.35. Арыі з італьянскіх опер і неапалітанскія песні выконвае Міхаіл Галкоўскі.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Чароўная сарна», «Цінкапавуцінка». Мультфільмы.
8.00. «Папугай, які гаворыць на ідыш». Маст. фільм.
9.25. «Дзень добры, Вольга! Хэло, Вольга!». Фільм-канцэрт.
10.30. Футбольны агляд.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Рытмічная гімнастыка.
11.55. Інстытут чалавека.
12.35. Фермата.
13.00. Дак. фільм «Невядомае золата».
14.00. Навіны.
14.25. «Аб спорце і не толькі». Уладзімір Зельдзін.
14.45. «Пра цябе». Маст. фільм.
16.10. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.25. Дасье
17.55. Мультфільмы.
18.15. Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. «Дынамо» (Масква) — ЦСКА. У перапынку (18.50) — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Уікэнд за мільён».
21.55. Фермата.
22.20. Мастацка - публіцыстычны фільм «Рэформа на крыві». Частка 3-я.
23.00. Навіны.
23.25. Лімпапо.
23.55. «Гукавая дарожка». ТБверсія.
00.25. «Пра цябе». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Урал-ТБ».
8.05. Французская мова. 1-ы год навучання.
8.35. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.50. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
9.50. Белая варона.
10.40. Расійскі конкурс бальных танцаў у г. Омску.
11.20. «Там, дзе неба ляжыць на зямлі». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Цяжкі ўзрост. «Артзона».
15.30. Прастора плюс.
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. «Свята Поўначы».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дзень добры, Святлана Ігараўна!» (Самара).
17.40. Вольны час. «Увага: здымаю!»
18.00. «Санта-Барбара». 32-я серыя.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае міграпаліт Валакаламскі і Юр'еўскі Піцірым.
20.25. «Сны пра Ізраіль». Фільм 5-ы. «Невядомы Ізраіль».
21.15. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.

8 красавіка, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Веснавы турнір». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 11 клас.
9.30. Тэлепраграма «Вёсачка».
10.05. «Бераг». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Шэраманец».
18.00. Дэбюты. Саюз кампазітараў Беларусі прадстаўляе...
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Сябры старыя і новыя».
19.40. Калыханка.
20.00. Хакей. «Дынамо» (Мінск) — «Дызеліст» (Пенза).
20.45. Метраном. «Хто выратуе нашы душы?» Музычна - публіцыстычная праграма. Прамая лінія.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Пека». Мультфільм.
7.45. Дзіцячы музычны клуб.
8.35. Маст. фільм «Сакрат». 1-я серыя.
9.40. Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. «Дынамо» (Масква) — ЦСКА.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. «Галасы гор». Дак. фільм.
11.45. Пад знакам «Пі».
12.35. Мультфільм.
12.55. Як дабіцца поспеху?
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. «Сёння і тады».
14.55. «Айя». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. Дыяна Рос. «Працуючы на знос».
17.00. Навіны.
17.25. Хранікальна - дакументальны фільм «Суд гонару».
18.15. Мультфільм.
18.40. Маст. фільм «Сакрат». 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. Хіт-парад «Астанкіна». Песні года.
22.20. Мастацка - публіцыстычны фільм «Рэформа на крыві». Частка 4-я.
23.00. Навіны.
23.25. Музычны прагноз.
23.50. Футбол. На шляху да Уэмблі.
0.50. «Айя». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Дакументальная панарама. «Чукокала».
8.00. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
8.30. Вольны час. «Увага: здымаю!»
8.45. Тэлетэатр. «Уцекачы».
10.50. Цяжкі ўзрост. «Арт-зона».
11.20. Нетрадыцыйная медыцына. У перадачы ўдзельнічае А. Чумак.
12.00. «Як хаваюць у Адэсе». Маст. фільм.
12.10. Іграе ансамбль «Малады джаз».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. «Канверсія». Магчымасці Урала.
15.30. «Дзяржава і асоба».
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. Хрысціянская праграма. «Загінуўшы свет».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Далёкі Усход».
17.45. «Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
18.00. Чэмпіянат Расіі па футболу. «Лакаматыў» (Н. Ноўгарад) — «Спартак» (Масква).
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Ноч». Мультфільм.
19.50. «Любы, дарагі, каханы, адзіны...». Маст. фільм.
21.00. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
23.30. Маленькія музычныя вечары. «Дзень нараджэння Расіні».

9 красавіка, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Прахіндзіяда, або Бег на месцы». Маст. фільм з субцітрамі.
10.10. «Балет Ігара Маісеева». Фільм-канцэрт.
16.30. Гісторыя Беларусі. 5 клас.
17.00. ПІК.
18.00. «М. Лужанін. «Недавершаная хата». Дак. фільм.
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. «Рамансы». Фільм-канцэрт.
20.00. Тыдзень беларускага ўрада.
20.15. Рэклама.
20.25. Калыханка.
20.45. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе... Студыя «КіТ».
22.45. НІКа.
23.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Дзіма адправіўся ў дарогу». Мультфільм.
7.55. «Уікэнд за мільён». Маст. фільм.
9.10. Конны спорт. Ліверпульскі стыль-чэз.
9.45. Маст. фільм «Сакрат». 2-я серыя.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Навукова - папулярны фільм «Да яких зорак мы ляцім?»
12.35. «Містэры і рэаліі Міхаіла Рамадзіна».
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Айя». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.55. «Пецька ў космасе». Маст. фільм.
17.00. Навіны.
17.25. «Жыў-быў хлопчык». Тэленарыс.
17.50. ...Да 16 і старэйшым.
18.30. Мультфільм.
18.40. Маст. фільм «Сакрат». 2-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мавізмы Марка Захарава.
21.55. «Ведзі».
23.00. Навіны.
23.25. «Кальвар-шоу». Музычная праграма.
0.10. «Айя». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.50. ТБ-атэлье.
8.05. «Там, дзе канчаюцца рэкі».
8.35. «К-2» прадстаўляе: праграмы «Каронка», «Пры сведках», «САС» і маст. фільм «Спакуса».
12.05. Гутарка без прэтэнзій.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. «Арэнбургскія вячоркі».
15.50. «Сібірскае пагаднение».
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. Тэрмінал.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Адкрыты свет.
17.40. «ТБ-атэлье».
17.55. Ключ да сусветнага рынку. «Амерыка: штат Масачусетс».
18.25. Расійская энцыклапедыя. «...І белыя калоны, і франтон з гербам».
18.40. Экспазэнтр прадстаўляе.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Пятае кола.
21.00. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
23.30. Арт-абстрэл.

10 красавіка, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Драўляныя рамёствы». Кінанарыс.
9.00. Гісторыя Беларусі. 5 клас.
9.30. «Апёк». Маст. фільм.
16.30. «Авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага». Тэлеспектакль па матывах п'есы П. Васючэнкі і С. Кавалёва.
17.15. «Пра Ксюшу і Кампгошу», «Басат, пераможца Цёпе-Гёза», «Казка пра старое рэха». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы «Мастацтва ўсіх часоў і народаў», «Доктар, зрабіце мяне прыгожай», «Як у садзе, у гародзе...»
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Цемра ў канцы тунеля».
19.40. Чарнобыль: праблемы, рашэнні.
20.00. Кампазітары Беларусі. Д. Смольскі. 3-я сімфонія.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Беларускі цэнтр занятасці насельніцтва прапануе... Прамая лінія.
21.35. «Жар-птушка», «Стралок», «Лекд». Мультфільмы для дарослых.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.
23.45. Іграе джаз-квартэт «Рэтра» з удзелам Вольгі Пірагс (Рыга).

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Доктар Айбаліт». Мультфільм. 1-я, 2-я, 3-я, 4-я серыі.
8.15. ...Да 16 і старэйшым.
8.55. Мавізмы Марка Захарава.
10.10. Адкрыццё мастака протаіерея Стэфана Дамусчы.
10.30. Крыніцы.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.10. Спорт для ўсіх.
12.40. Кубанскае вяселле.
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.20. «Гармонік». Дак. фільм.
14.35. «Голад сэрца». Маст. фільм (Польшча).
16.00. Вас запрашае мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля песні і танца Удмурціі «Італмас» А. Мамантаў.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.05. «Піф-паф! Вой-вой-вой!». Мультфільм.
18.25. Маст. фільм для дзяцей «Эміль з Ленебергі». (Швецыя). 2-я серыя «Як Эміль трапіў у супніцу».
18.50. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цуду».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. «ВІД» прадстаўляе: «Матадор», «Музагляд», «Танг», «Шоу-біржа», «Хіт-канвеер». У перапынку (23.00) — Навіны.
0.20. Зоркі бальнага танца ЗША ў Маскве.

Канал «Расія»

9.05. Тэрмінал. «Камдэк-92».
9.20. Адзін на адзін пры сведках. І. Шведава.
10.05. XX стагоддзе ў кадры і за кадрам. Да 60-годдзя з дня нараджэння Андрэя Таркоўскага.
11.00. «Блазан». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Першы тайм.
15.25. «Цвярскі ракурс».
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дакуль».
17.45. Версія.
18.00. «К-2» прадстаўляе: «Абзац», «Кінограф», «3, 2, 1». Мастацка - публіцыстычны фільм «Асабовая справа Ганны Ахматавай».
21.05. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.20. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
23.30. Начны акцёрскі клуб.

11 красавіка, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Запаведнік на Моншы». Кінанарыс.
8.55. «Нябесныя ластаўкі». Маст. фільм. 1-я серыя.
10.00. Паказвае Гомель. Інфармацыйна - публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Чалавек. Аўтамабіль. Дарога.
11.35. 20 мінут рэдактара.
11.55. Л. Герш. «Гэтыя вольныя матылькі». Спектакль акадэмічнага тэатра імя Камісаржэўскай.
14.00. Паміж намі, жанчынамі... Праблемы мнагадзетнай сям'і.
14.50. Голас. Літаратурна - мастацкі відэаканал для школьнікаў.
15.45. «Снегураты». «Сястрычкі - прывычкі». Мультфільмы.
16.05. Гастролі. Конкурсы. Прэм'еры... Музычная праграма.
17.15. Процістаянне. Маральна - прававая праграма.
18.00. Адкрыццё фестывалю мастацтваў «Мінская вясна».
19.00. Панарама.
19.25. Адкрыццё фестывалю мастацтваў «Мінская вясна». 2-е аддзяленне.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. «Не пытай у мяне. Запытай у Бога». Інфармацыйна - гуманітарная праграма Хрысціянскага тэлебачання «Сі-Бі-эн» (ЗША).
22.00. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Сціплая абаяльнасць буржуазіі» (Францыя).
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.35. «Доктар Айбаліт». Мультфільм. 5-я, 6-я, 7-я серыі.
8.00. Відэаканал «Садружнасць».
9.15. Радыё «Труба». Раніцяная забаўляльная праграма.
9.45. «Чума». Навукова - папулярная праграма.
10.30. Цэнтр.
11.10. ЭХ.
11.25. С. Рахманінаў. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам.
12.05. Кніжны двор.
12.55. Фільм-балет Ф. Слідоўкера і А. Тафеля «Прасвятленне».
13.30. «Служэнне муз не церпіць мітусні». Рускія ў Парыжы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дак. фільм «Чырвоная імперыя». 1-я серыя «Рэвалюцыянеры» (Вялікабрытанія).
15.20. Мультфільм «Пунсовая кветачка».
16.20. Чырвоны квадрат.
17.00. «Пчала Мая».
17.35. У свеце жывёл.
18.20. Маст. фільм «І яны не хочуць ісці». (Італія). 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «І яны не хочуць ісці». 2-я серыя.
22.05. Брэйн рынг.
23.00. Навіны
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень 1-ы.
0.05. «Тры дні без перадышкі». Маст. фільм з серыі «Дэрык» (Германія).

Канал «Расія»

8.30. «Падарожжа па закрытай Трацціякоўцы».
9.30. Праграма 03.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. Расійскае бюро падарожжаў.
12.30. «Этыка здароўя». Сустрэча з біяэнергетыкам, парапсіхолагам і паэтам Анатолем Мартынавым.
13.00. Весткі.
13.20. А. Купрын. «Гамбрынус». Спектакль - мюзікл тэатра-студыі «Ля Нікіцкіх варот».
15.35. «Багацце духу».
16.00. Дзённік З'езда.
16.15. «Познер і Донах'ю».
17.10. «Міс мільянерка». Маст. фільм.
18.45. Экспазэнтр прадстаўляе...
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Музыка ў стылі пепсі».
21.30. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.

12 красавіка, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Нябесныя ластаўкі». Маст. фільм. 2-я серыя.
9.50. Латарэя аўтографаў. Пазнавальная праграма для дзяцей.
10.45. Асілак. Прамая лінія.
11.25. Сёння — Дзень войск процівапаветранай абароны. Справы вайсковыя. Прымае ўдзел камандуючы арміяй ППА генерал - лейтэнант В. М. Асмалоўскі.
12.10. «А дзе мне ўзяць такую песню». Дак. фільм.
12.30. Пра шахматы і шахматыстаў.
13.00. НІКа.
13.45. «Імя адной я зоркі паўтараю...». Дак. фільм.
14.10. «Песні роднага краю». Музычны фільм.
14.30. «Лёс, які мы выбіраем». Сустрэча са звяроўдам М. В. Каралём з Пінчыны.
14.45. «Па шчупаковаму загаду», «Белая чапля». Мультфільмы.
15.20. «Брава, Альбер Ланіш!» Маст. фільм з субцітрамі.
16.55. «Савітар-цэнтр». П. Глоба аб практычнай астралогіі.
17.45. «Хто не смяецца, той не мае поспеху». Шоу-праграма.
19.00. Панарама.
19.25. Палескі смутак. Творчы вечар Міколы Мятліцкага.
20.25. Калыханка.
20.50. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Сувяз праз піцэрыю». (Італія).
22.20. Начное рандэву. Музычная праграма.

І канал. Астанкіна

6.00. «Гадзіна сілы духу».
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. Авіяшоу ў Кубінцы.
8.15. Раным-рана.
8.55. «Магчыма ўсё».
9.25. Раніцяная зорка.
10.15. «Вясёлка». Кірмаш у храме культуры Шанхая ў свята поўні Юаньсяо» (Кітай).
10.35. Пад знакам «Пі».
11.05. Авіякасмічны салон.
11.35. Марафон-15.
12.25. «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
14.00. Навіны.
14.20. Дыялог у прамым эфіры (А. Гарбукоў).
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Панарама.
16.45. Тэлеэлюсія.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. «Хто з намі?» Перадача 7-я.
18.15. Маст. фільм «Рабро Адама».
19.45. Тэатр плюс ТКЖ.
21.00. Вынікі.
21.45. Дак. фільм «Не пытай у мяне, запытай у Бога» (ЗША).
22.45. Канцэрт з твораў Н. Паганіні выконвае В. Трацціякоў (скрыпка).
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень 2-гі.
0.05. «Парадыз-кактэйль».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Маманты - татанты». Маст. фільм.
8.35. «Гадаванцы чыстых натхненняў...»
9.20. Хочаце — верце...
9.50. Зігзаг удачы. Адборачны тур.
10.00. «Суперкніга». Мультфільм. 8-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. Дакументальная панарама. «Наследнікі з Калькуты».
12.00. Галоўны рэдактар часопіса «Грані» Е. Брэйбарт-Самсонава ў праграме «На рагу «Праўды» і Ямскога поля».
12.30. «Вурда модэн» прапануе...
13.00. Весткі.
13.20. Мастацтва адлюстравання. «Мы ўсе таксама пчушкі...»
13.45. «Начальнік Чукоткі». Маст. фільм.
15.20. І. Стравінскі. «Апалон». Аднаактовы балет у выкананні артыстаў Марыінскага тэатра.
16.05. Рэтра. Вечар Мікалая Нікіцкага.
16.55. ТБ-свацця.
17.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
18.00. Спявае Дзмітрый Хварастоўскі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Маст. фільм «Магі» (Францыя). Фільм 6-ы «Страсці вакол гольфа».
20.00. Маскі-шоу.
20.40. «Сяргей Юрскі запрашае...» Дабрачынны канцэрт.
22.00. Весткі.
22.20. «Спартыўная карусель».
22.30. «Пан афарміцель». Маст. фільм.
0.15. Рок-кафэ.

КРЫЖАВАНКА



ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 5. Паэма Р. Барадуліна. 6. Творчае аб'яднанне студыі «Беларусьфільм». 10. Скульптар, народны мастак Беларусі, аўтар помнікаў М. Багдановічу і К. Каліноўскаму. 11. Вялікае возера ў Беларусі. 12. Папулярная перадача Беларускага тэлебачання. 15. Беларускі вакальна-інструментальны ансамбль. 18. Эстрадны спявак, дыпламант конкурса «Залаты Арфей». 19. Удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці. 20. Кампазітар, аўтар балета «Салавей». 21. Вянок санетаў А. Сербантовіча. 25. Беларускі першадрукар, вучоны, асветнік. 26. Гарадскі пасёлак на Гомельшчыне. 27. Беларускі географ і вазеразнавец. 31. Карціна жывапісца В. Волкава. 33. Кінаржысёр, заснавальнік беларускай мастацкай кінематаграфіі. 34. Знакі старажытнага безлінейнага нотнага пісьма. 35. Народнае свята заканчэння ўборкі збожжавых. 36. Традыцыйны народны звычай і абрад пры заключэнні шлюбу.

ПА ВЕРТЫКАЛЯХ: 1. Пейзажны парк у Нясвіжы. 2. Беларускі драматург, аўтар п'есы «Гаўроішы Брэсцкай крэпасці». 3. Рэспубліканскі спартыўны комплекс. 4. Партызанскі псеўданім М. Шмырова, кіраўніка партызанскага руху на Віцебшчыне. 7. Абутковае вытворчае аб'яднанне ў Мінску. 8. Мастак, арганізатар і першы дырэктар карцінай галерэі ў Мінску. 9. Беларускі фільм 30-х гадоў. 13. Чыгуначны вузел на Магілёўшчыне. 14. Вакальны квартэт ансамбля «Харошкі». 16. Беларускі народны музычны інструмент. 17. Беларускі жанр фальклору. 22. Стадыён у Мінску. 23. Жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтва рэспублікі. 24. Салігорскі дзіцячы ансамбль танца. 26. Мемарыяльны комплекс на Лагойшчыне. 29. Персанаж паэмы Я. Коласа «Новая зямля». 30. «Гара», адзін з найвышэйшых пунктаў Беларусі. 32. Народны пісьменнік Беларусі.

Склаў В. ПІНЧУК.

г. Бабруйск.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 28 САКАВІКА

Па гарызанталях: 4. Зайздрасць. 6. Лад. 9. Рэшткі. 10. Званок. 13. Накід. 14. Сенакос. 16. Лішак. 17. Папрок. 18. Натоўп. 20. Імгла. 21. Апал. 22. Слімак. 25. Пырнік. 27. Мелес. 28. Адзнака. 29. Лямеш. 30. Прагал. 32. Восець. 34. Ява. 36. Колькасць.

Па вертыкалях: 1. Павет. 2. Арфа. 3. Уцеха. 5. Жэрдка. 6. Ліснік. 7. Дзікун. 8. Поплаў. 11. Каромысел. 12. Дабрадзей. 14. Стрэмка. 15. Сутарга. 17. Пас. 19. Пак. 23. Люстра. 24. Казуля. 25. Праява. 26. Ігліца. 31. Гучок. 33. Сенцы. 35. Века.

СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ

АПУКА

У мінулым выпуску «Суботнім вечарам» (28 сакавіка) мы прапанавалі нашым чытачам згуляць у паўзабытую беларускую народную гульню — гулу.

Сёння ж мы расказваем яшчэ пра адну гульню, якой калісьці захаплялася моладзь, асабліва вясковая, — пра апуку.

Гуляюць у яе дзве каманды па 4—6 чалавек у кожнай. Гэта найбольш зручная для гульні колькасць. Кожная каманда выбірае сабе вядучага. На роўнай пляцоўцы праводзяцца дзве лініі паміж камандамі на адлегласці 30—40 метраў адна ад адной.

Удзельнікі каманды «горада» па чарзе, пачынаючы з вядучага, выбіваюць бітай у бок каманды праціўніка (у «поле») апуку — мяч памерам з тэнісны. Задача гульцоў «палявой» каманды — злавіць апуку з лёту. Калі гэта ўдалося, то каманды мяняюцца месцамі.

Калі — не, то «палявыя» гульцы павінны як мага хутчэй падхапіць апуку і кінуць яе, каб пап